ШТО ЗРАБІЦЬ, КАБ ДЗІЦЯЦІ ЗАХАЦЕЛАСЯ Ў САДОК? Сямейная

КАВА МОЖА ЗАХАВАЦЬ ШЛЮБ... Сямейная

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

4 ЛІСТАПАДА 2021 г. ЧАЦВЕР № 213 (29582)

ЦЫТАТА ДНЯ

Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр:

«Ужо другі год транспартны сектар краіны працуе ў няпростых умовах, звязаных як з эпідэмічнай сітуацыяй, так і з пэўнымі знешнімі фактарамі. Тым не менш, ён устойліва выконвае асноўныя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця, уключаючы зводныя мэтавыя паказчыкі дзяржаўных праграм. Што датычыцца авіяцыйнай галіны, яна працуе ва ўмовах, звязаных з абмежаваннямі адносна авіякампаніі «Белавія» і іншых авіяперавозчыкаў Беларусі. Сітуацыя ў авіяцыйным сектары застаецца стабільнай. І вынікі работы галіны за 9 месяцаў паказваюць яе ўстойлівае функцыянаванне. Транспартныя паслугі, з улікам трубаправоднага транспарту, па-ранейшаму з'яўляюцца адной з асноўных крыніц паступлення ў краіну валюты і фарміруюць больш як 40 працэнтаў агульнага аб'ёму экспарту паслуг і дадатнага сальда знешняга гандлю паслугамі. Ключавы паказчык эфектыўнасці работы Мінтранса — экспарт транспартных паслуг — за студзень—жнівень склаў 119 працэнтаў да адпаведнага перыяду 2020 года. Але станоўчую дынаміку неабходна нарошчваць».

КАРОТКА

- **МНС вызначана органам дзяржкіравання ў галіне абыходжання з радыеактыўнымі адходамі.**
- XXVII Мінскі міжнародны кінафестываль «Ліставпад» пройдзе з 20 да 26 лістапада пад слоганам «Кіно — сімфонія адзінства».
- **Уладзімір Макей 9—10 лістапада наведае Маскву, дзе адбудзецца суменае пасяджэнне калегій МЗС Беларусі і РФ.**
- У Гродне ўстанавілі помнік генералу Аляксею Антонаву.

ISSN 1990 — 763X

Гісторыя з матэматычнай дакладнасцю



Гісторыя невялікіх Бешанковічаў цікавая і, можна сказаць, вялікая. Пра гэта ведае і красамоўна распавядае мясцовы жыхар Станіслаў ЛЕАНЕНКА. Па адукацыі ён настаўнік матэматыкі, але цікавасць да гістарычных падзей, археалогіі, архітэктуры і рэлігіі вывела на іншую сцяжыну — краязнаўства. Яго займаюць і знакавыя асобы, якія ў свой час жылі тут альбо прыпыняліся, і сярэднявечныя майстры, і старажытны побыт рачнога дзвінскага порта. Навуковы падыход да гістарычнай тэмы і матэматычная дакладнасць падзей і артэфактаў зрабіла Станіслава сапраўдным прафесіяналам-гідам. Да яго часта звяртаюцца, каб правесці экскурсію, яму звоняць і раяцца навукоўцы з Акадэміі навук. На працягу двух гадоў Станіслаў працуе навуковым супрацоўнікам у раённым гісторыка-краязнаўчым музеі. Па-ранейшаму яго любімае месца ў горадзе — бераг Заходняй Дзвіны, пантонны мост, Задзвінне — шмат значных і лёсавызначальных падзей адбылося на бешанковіцкіх берагах.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Школа актыўнага грамадзяніна

ДАНЕСЦІ САМАЕ ВАЖНАЕ

Дэпутат расказала школьнікам, чаму мы можам ганарыцца нашай медыцынай

Медык — самая гуманная і бескарыслівая прафесія ва ўсім свеце. Яе важнасць усе мы асабліва ўсвядомілі падчас пандэміі COVID-19. І калі дарослым тлумачыць значэнне сучаснай дыягностыкі, новых тэхналогій і метадаў лячэння, наяўнасці кваліфікаваных урачоў не трэба, то з дзецьмі — крыху іншая гісторыя. Данесці, як важна сачыць за сваім здароўем, своечасова звяртацца да доктара, весці актыўны лад жыцця, а таксама ведаць і ганарыцца тымі дасягненнямі ў медыцыне, якія маюцца сёння, — такая мэта аднаго з тэматычных урокаў адукацыйнага праекта ШАГ (Школа Актыўнага Грамадзяніна). У сталічнай школе № 165 госцем такога ўрока для васьмікласнікаў стала дэпутат, старшыня Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, доктар медыцынскіх навук Людміла МАКАРЫНА-КІБАК.

— Я ўрач, доктар медыцынскіх навук, 31 год працую тым доктарам, якога прынята называць «вуха-горла-нос». Я шмат працавала і вось стала дэпутатам нашага парламента. Сёння я смела магу казаць пра тое, што гонарам нашай нацыі з'яўляецца ахова здароўя, — пачала ўрок на зразумелай для школьнікаў мове парламентарый.

Старшыня камісіі распавяла пра работу службы отарыналарынгалогіі, якую яна ўзначальвала цэлае дзесяцігоддзе. Гэта і развіццё кахлеарнай імплантацыі (калі дзеткам з частковай ці поўнай стратай слыху дзякуючы пратэзаванню ўдаецца аднавіць здольнасць чуць), і слухапратэзаванне, і магчымасць выяўлення парушэнняў слыху ў нованароджаных дзяцей.

СТАР. 2

Харчовая бяспека

ЗАПАС БЯДЫ НЕ ЧЫНІЦЬ

У паўднёва-ўсходнім рэгіёне краіны анамальна засушлівае лета паўплывала на ўраджайнасць гародніны. Але харчовы дэфіцыт не пагражае. Цяпер тут працягваецца рэалізацыя сельгаспрадукцыі айчыннай вытворчасці, у тым ліку ў папулярным фармаце выязнога гандлю. Актыўна ідзе і закладка запасаў садавіны і гародніны на сезоннае захоўванне.

СТАР. 4

Нарыхтоўка гародніны ў ААТ «Камбінат «Усход».

СРОДКІ НА ЛЕКІ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў два важныя дакументы, датычныя самай запатрабаванай на сёння сферы — медыцыны

Кіраўнік дзяржавы падпісаў распараджэнне аб выдзяленні Міністэрству аховы здароўя дадатковых сродкаў з рэзервовага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у суме 140 млн рублёў. Сродкі будуць накіраваны на набыццё вакцын супраць COVID-19, а таксама лекавых прэпаратаў, у тым ліку проціпухлінных, процітуберкулёзных, сардэчных і іншых.

Гэта дасць магчымасць забяспечыць якаснае аказанне медыцынскай дапамогі, у тым ліку планавай, бесперабойную пастаўку ў арганізацыі аховы здароўя лекавых сродкаў, уключаючы вакцыны.

Таксама Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ аб рэалізацыі ў 2021—2023 гадах інвестыцыйнага праекта па арганізацыі вытворчасці айчыннай вакцыны супраць COVID-19 на плошчах ААТ «БелВітуніфарм». Гэты інвестпраект прадугледжвае будаўніцтва ў вёсцы Доўжа Віцебскай вобласці завода па вытворчасці вакцын (з рэканструкцыяй існуючай вытворчасці). Вытворчая база ААТ «БелВітуніфарм» вызначана ўрадам як найбольш перспектыўная пляцоўка для доследна-прамысловай вытворчасці вакцыны, зыходзячы са ступені гатоўнасці інфраструктуры, наяўнасці падрыхтаваных спецыялістаў, а таксама магчымасці далейшага развіцця біятэхналагічнага кластара.

Распрацоўка айчыннай вакцыны вядзецца падведамнымі Міністэрству аховы здароўя і Нацыянальнай акадэміі навук арганізацыямі. Цяпер падрыхтавана серыя прататыпнага варыянта вакцыны.

Указам прадугледжваецца вызваленне тэхналагічнага абсталявання, сыравіны і матэрыялаў, што ўвозяцца на тэрыторыю краіны для рэалізацыі інвестыцыйнага праекта, ад абкладання ўвазнымі мытнымі пошлінамі і падаткам на дабаўленую вартасць.

Паводле прэс-службы Прэзідэнта.

❍ Каментарый у тэму

Выдзяленне140 млн рублёў з рэзервовага фонду Прэзідэнта стала вельмі сур'ёзнай дапамогай сістэме аховы здароўя ў няпросты час, заявіў журналістам **намеснік міністра аховы здароўя Барыс АНДРАСЮК**, перадае БелТА.

«Безумоўна, гэта вельмі сур'ёзная дапамога з боку кіраўніка дзяржавы. Хочацца выказаць словы ўдзячнасці за ўвагу, якая аказваецца сістэме аховы здароўя ў гэты цяжкі час», — сказаў Барыс Андрасюк.

Паводле яго слоў, планы цэнтралізаванай закупкі складзены. Частка сродкаў пойдзе на закупку вакцыны супраць COVID-19, частка — на закупку прэпаратаў для барацьбы з ковідам, частка — на іншыя прэпараты, у тым ліку для лячэння анкалагічных пацыентаў.

Што датычыцца вакцыны, намеснік міністра аховы здароўя адзначыў: «Закупляецца, паводле маіх звестак, каля 1 млн доз замежнай вакцыны, паўмільёна доз прыходзіць у якасці бязвыплатнай дапамогі». Акрамя таго, будзе закуплена 250 тысяч доз расійскай вакцыны. «Гэта значыць, мы забяспечым вакцынацыяй 60 працэнтаў насельніцтва, безумоўна. Гэты той мінімум, які абароніць насельніцтва краіны ад распаўсюджвання пандэміі», — сказаў Барыс Андрасюк.

Парламенцкі дзённік

Эканоміка — фундамент усіх адносін

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў пазнаёміліся з новым паслом Азербайджана ў Беларусі

Сустрэча з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Азербайджана ў Беларусі Ульві Бахшаліевым прайшла пад кіраўніцтвам Старшыні ніжняй палаты парламента Уладзіміра Андрэйчанкі. Спікер заявіў, што краіны дасягнулі значных вынікаў у гандлі, але ёсць шмат кірункаў, якія могуць стаць кропкамі для актывізацыі ўзаемадзеяння.

«Мы цэнім адносіны, што склаліся ў Беларусі з Азербайджанам. Галоўнае, што яны развіваюцца пазітыўна і ў эканоміцы, і ў палітыцы, і ў культуры, і ў адукацыі. Канешне, выключная роля ў гэтым належыць прэзідэнтам нашых дзяржаў», — сцвярджае спікер Палаты прадстаўнікоў.

Па яго словах, галоўная задача — захаваць і памножыць супрацоўніцтва. Сёння дэпутаты дзвюх краін выступаюць з адзіных пазіцый на разнастайных міжнародных пляцоўках, бо погляды на шматлікія падзеі супадаюць.

«Што датычыцца нашых двухбаковых адносін, то я думаю, што пандэмія ў рэшце рэшт скончыцца. У наступным годзе нам неабходна арганізаваць сустрэчы на ўзроўні кіраўніцтва парламентаў, старшынь пастаянных камісій, камітэтаў, рабочых груп», — кажа Уладзімір Андрэйчанка.

Ён адзначае, што дэпутаты з вялікай ахвотай запісваліся ў рабочую групу па супрацоўніцтве з Азербайджанам, і прапануе ў найбліжэйшы час арганізаваць сустрэчу пасла з яе саставам.

«Там можна вызначыць далейшыя кірункі супрацоўніцтва, магчыма, нават скласці нейкую дарожную карту. Вядома, галоўнае — гэта эканоміка. Бо, як бы мы ні гаварылі, гэта фундамент усіх адносін. І наш тавараабарот за восем месяцаў у 350 мільёнаў долараў паказвае рост на 30 працэнтаў да мінулага года, нягледзячы на пандэмію», — акцэнтаваў увагу кіраўнік ніжняй палаты парламента.

Па яго словах, актывізацыі патрабуюць пытанні сумеснай дзейнасці ў прамысловай кааперацыі, сельскай гаспадарцы, адукацыі, турызме.

«Кірункаў, па якіх можам працаваць, шмат. Я думаю, стварыць дарожную карту вельмі важна», — заяўляе Уладзімір Андрэйчанка.

Ульві Бахшаліеў паведаміў: за два месяцы, што ён знаходзіцца ў краіне, паспеў правесці шмат сустрэч, паездзіць па рэгіёнах і пазнаёміцца з машынабудаваннем, аграрным сектарам Беларусі. Гэтыя сферы, па яго словах, з'яўляюцца сёння прыярытэтнымі ў двухбаковых адносінах.

Пра важнасць эканамічных набыткаў праз узаемадзеянне дэпутацкай супольнасці краін гаворыць і намеснік кіраўніка рабочай групы па супрацоўніцтве з парламентам Азербайджана Лілія Ананіч. «Рабочая група — дзейсны механізм парламенцкага супрацоўніцтва, развіцця чалавечых кантактаў і ўзаемадзеяння на ўсіх пляцоўках. Мы бачым сёння сваю задачу ў актывізацыі гэтай работы і вельмі хацелі б, каб адбылася вочная сустрэча дзвюх рабочых груп ці ў Мінску, ці ў Азербайджане. Пра гэта і будзем гаварыць», — адзначыла Лілія Ананіч.

Марыя ДАДАЛКА.

На кантролі

«НЕОПАРК» З'ЯВІЦЦА Ў СТАЛІЦЫ

Развіццё тэрыторыі холдынга «Гарызонт» абмеркавалі на нарадзе ў Савеце Рэспублікі

Яна адбылася пад старшынствам спікера верхняй палаты парламента, упаўнаважанай кіраўніка дзяржавы па горадзе Мінску Наталлі КАЧАНАВАЙ.

— Мы чарговы раз сабраліся, каб абмеркаваць даручэнне Прэзідэнта нашай краіны аб комплексным выкарыстанні плошчаў «Гарызонта», эфектыўным выкарыстанні будынкаў, якія ёсць, адкрыцці новых вытворчасцяў, — нагадала ўдзельнікам нарады Старшыня Савета Рэспублікі. — Мы дамовіліся і распрацавалі адпаведны план-графік па комплексным выкарыстанні гэтых тэрыторый. Таму сёння я хацела б пачуць, як прасоўваецца рэалізацыя гэтага вельмі важнага для нашай краіны праекта.

Аб тым, як ідзе рэалізацыя ўхваленай кіраўніком дзяржавы канцэпцыі стварэння інавацыйнай вытворчасці на тэрыторыі холдынга «Гарызонт» у межах вуліцы Куйбышава — праспекта Машэрава — вуліц Чырвоная і Кісялёва, удзельнікам нарады расказаў генеральны **дырэктар ААТ «Кіруючая кампанія холдынга «Гарызонт» Юрый ПРАДКО.**

Паводле яго слоў, рэалізацыя канцэпцыі дазволіць стварыць унікальную для краіны тэрыторыю перадавых тэхналогій і вытворчых інавацый, сучасны навукова-тэхналагічны інавацыйны комплекс па распрацоўцы і камерцыялізацыі новых тэхналогій, стварыць новыя працоўныя месцы і акумуляваць інтэлектуальны патэнцыял краіны і стварыць на пляцоўцы прадпрыемства тэрыторыю вытворчых інавацый («інавацыйна-вытворчы «NeoПарк»). Усе мерапрыемствы плануецца ажыццявіць у бягучай пяцігодцы.

Гаворка ідзе і аб стварэнні інавацыйнай вытворчасці ў «NeoПарку»:

— На сёння першая распрацоўка, якую мы робім, — гэта разумнае кіраванне электрычнасцю, калі прасцей — інавацыйная разумная разетка, — тлумачыць суразмоўнік. — Яна будзе складвацца з комплексу функцый, якія, як LEGO, можна набіраць: раздаваць, кіраваць электрычнасцю, карыстацца магчымасцямі акустыкі (дынамікаў).

Ён адзначыў, што распрацоўка дастаткова запатрабаваная: холдынг ужо атрымаў заказ адной буйной кампаніі на выраб мільёна такіх хатніх памочнікаў у год.

— Гэта адзін з першых прадуктаў. Далей усё звязана з «разумным домам», «разумным горадам», «сістэмамі кіравання», у тым ліку і ў тэлевізійнай вытворчасці, — дзеліцца планамі генеральны дырэктар холдынга.

Дырэктар ЗАТ «Гарызонт-Белінвест-Дэвелапер» Іна КАВАЛЁВА расказала, што на прадпрыемстве ўжо прыступілі да практычнай рэалізацыі праекта:

— Пачалі з першай чаргі: гэта два корпусы, з якіх і будзе пачынацца наш вытворчы «NeoПарк». Ужо распачаты будаўніча-мантажныя работы (унутраныя і знешнія), у найбліжэйшы час вы зможаце ўсё ўбачыць самі, — паабяцала яна напрыканцы.

Вольга АНУФРЫЕВА.

ДАНЕСЦІ САМАЕ ВАЖНАЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Я сама была ўражана, калі ўпершыню ўбачыла чатырохмесячнае дзіця, якога мы пратэзавалі: яно яшчэ не размаўляе, а мы разумеем, наколькі добра яно чуе.

Таксама парламентарый распавяла пра зніжэнне мацярынскай і дзіцячай смяротнасці, лячэнне нованароджаных і дзяцей ад розных захворванняў, у тым ліку і анкалагічных.

— Мы ганарымся, што сёння дзеткі, якія маюць анкалагічныя хваробы крыві, амаль у 100 % выпадкаў папраўляюцца. Мы сёння можам аперыраваць сэрца дзіцяці, якое пакуль не нарадзілася і знаходзіцца ў мамі-

Людміла МАКАРЫНА-КІБАК уручыла школьнікам кнігі «Я — грамадзянін Рэспублікі Беларусь».

ным жываце, — адзначыла Людміла Макарына-Кібак. А таксама расказала пра аперацыі на сэрцы для дарослых, якіх паспяхова лечаць пры інфарктах: або з дапамогай кропельніц, або выконваючы эндаскапічныя аперацыі, калі праз сасуд уводзіцца стэнт.

Закранула парламентарый і тэму каранавіруснай інфекцыі, а таксама расказала, як яе ад COVID-19 лячылі студэнты.

— Мы ганарымся той медыцынскай дапамогай, якая ў нас ёсць. Менавіта падчас эпідэміі мы зразумелі, як правільна зрабілі, што захавалі ложкавы фонд і тую школу падрыхтоўкі кадраў, якая гатовая ў любую хвіліну прыйсці на дапамогу пацыенту. Я лічу, што наша сістэма падрыхтоўкі медыкаў — найлепшая ў свеце. Я таксама перахварэла на каранавірусную інфекцыю. І да мяне з паліклінікі прыходзілі студэнты 6 курса, якія цудоўна ведалі, што і як рабіць. І мне прыемна, што іх досведу і навыкаў хапіла, каб вылечыць такога сур'ёзнага ўрача, як я, — пажартавала Людміла Макарына-Кібак.

Развіццё службаў анкалогіі, кардыялогіі, транспланталогіі, прадстаўнікі якіх выконваюць аперацыі не толькі беларусам, але і выязджаюць за мяжу, каб падзяліцца сваім досведам і напрацоўкамі, аснашчэнне бальніц і паліклінік высокатэхналагічным абсталяваннем — тое, што таксама сёння з'яўляецца прадметам гонару.

Падзяліліся ўражаннямі пасля такога ўрока і школьнікі.

— Я лічу, што мы можам ганарыцца нашымі медыкамі, якія цяпер, падчас пандэміі каранавіруса, змагаюцца за здароўе людзей. У мяне вельмі цяжка хварэла бабуля, яе вылечылі, і цяпер усё добра. Нашы ўрачы лечаць і ад іншых страшных хвароб. У нас добрыя хірургі, якія аперыруюць нават маленькіх дзетак, яны выязджаюць за мяжу і прадстаўляюць нашу краіну на розных міжнародных семінарах і канферэнцыях, — падзялілася Паліна Ігнацёнак, вучаніца 8 «Г» класа.

— Калі мы будзем расказваць дзецям у школах, над чым працавалі апошнія дзесяцігоддзі і што нам ёсць чым ганарыцца, яны дакладна вырастуць дастойнымі грамадзянамі нашай краіны, — рэзюмавала парламентарый у размове з журналістамі.

Алена КРАВЕЦ.

Мясцовая ўлада

«ТАМ, ДЗЕ ЁСЦЬ ЭКАНОМІКА, ЗАСТАЕЦЦА І МОЛАДЗЬ»

Як у райцэнтры працуюць з маладымі спецыялістамі

Сёлета ў Крупскі раён прыехалі па размеркаванні 112 дыпламаваных выпускнікоў. Іх гасцінна сустрэлі ў рэгіёне. Забяспечылі жыллём тых, хто меў патрэбу. Традыцыйнымі сталі сустрэчы старшыні райвыканкама, яго намеснікаў, спецыялістаў адпаведнага профілю з моладдзю, каб адказаць на любое пытанне. Апроч іншага, у рэгіёне вялікую ўвагу аддаюць патрыятычнаму выхаванню новага пакалення. Пра гэта і іншае расказаў «Звяздзе» старшыня райвыканкама Анатоль КОЗЕЛ.

— Анатоль Станіслававіч, на Крупшчыне рэалізоўваецца цікавы маладзёжны сацыяльны праект — «Партрэт краіны». Што ён прадугледжвае?

— Праект накіраваны на разуменне сітуацыі, якая складваецца ў краіне, вызначэнне і захаванне каштоўнасных арыенціраў грамадства, матывацыю да сацыяльнай і эканамічнай актыўнасці моладзі, садзейнічанне захаванню і развіццю рэгіёна, краіны.

Вельмі жывая, насычаная шматлікімі пытаннямі атрымалася сустрэча моладзі Крупшчыны з Вадзімам Гігіным, дэканам факультэта філасофіі і сацыяльных навук Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, адным з самых вядомых палітолагаў краіны. Спікер добра валодаў увагай аўдыторыі, адчуваў яе настрой, падтрымліваў цікаўнасць, выслухваў думкі наконт значных палітычных падзей у нашай краіне, разважаў аб грамадска-палітычным і эканамічным аспектах развіцця дзяржавы, параўноўваючы іх з іншымі краінамі свету. Удзельнікі атрымалі адказы на хвалюючыя пытанні, ва ўсіх засталося сапраўды вялікае ўражанне ад сустрэчы.

Надзвычай цікавай атрымалася размова з кандыдатам эканамічных навук, рэктарам Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіраўнікоў і спецыялістаў прамысловасці Георгіем Грыцам пра сусветную і рэгіянальную эканоміку, інвестыцыйную палітыку і стратэгічнае бізнес-планаванне.

Аналагічнае мерапрыемства правялі дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Генадзь Давыдзька, кандыдат філасофскіх навук, загадчык аддзела сацыялогіі дзяржаўнага ўпраўлення Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Мікалай Шчокін. Рабочая моладзь змагла абмеркаваць розныя надзённыя пытанні і падыскутаваць з палітычным аглядальнікам тэлеканала АНТ Ігарам Турам.

Адкрыты дыялог ідэалагічнага актыву рэгіёна прайшоў са старшынёй Каардынацыйнага савета грамадскіх аб'яднанняў, палітычных партый і прафсаюзаў Кастрычніцкага раёна Мінска Уладзімірам Цюхаем.

krupki.by

— У практыку работы трывала ўвайшоў вопыт, калі вы вывозіце моладзь на прадпрыемствы. Што даюць такія экскурсіі?

— Мы паказваем, што ў райцэнтры ёсць сучасная вытворчасць. Яна не такая буйная, як у іншых гарадах, аднак эфектыўная.

Ладзім таксама выязныя мерапрыемствы з удзелам рабочай моладзі. У прыватнасці, пабывалі на ААТ «БелАЗ», ААТ «Беларуськалій», дзе адбыўся адкрыты дыялог з кіраўніцтвам айчынных флагманаў. Акрамя таго, наведалі культурна-гістарычныя аб'екты, адметныя мясціны Жодзіна і Салігорска.

Такія мерапрыемствы дапамагаюць пераканацца, адчуць, якая цікавая і багатая ў нас краіна, аб'ядноўваюць маладых людзей, дазваляюць ім пазнаёміцца, пасябраваць з калегамі з розных сфер народнай гаспадаркі.

Наша моладзь актыўна ўдзельнічае ў добраўпарадкаванні горада і раёна, у акцыі «Чысты лес», патрыятычных аўтапрабегах, турыстычных злётах, спартыўных і культурных святах, творчых мерапрыемствах. Мы ставім задачу аб'яднання маладых менавіта праз нефармальныя сустрэчы.

— Раскажыце больш падрабязна пра патрыятычнае выхаванне.

— Яно пачынаецца яшчэ ў дзіцячым садку, у школе. У Крупках некалькі гадоў таму быў створаны ваенна-патрыятычны клуб «Рубеж». Яго наведвае больш як сто школьнікаў, у тым ліку і малодшых класаў. Мы закупілі дзецям ваенную форму, у якой яны прысутнічаюць на ўсіх значных раённых мерапрыемствах, падчас дзяржаўных свят. Удзельнікі клуба наведваюць воінскія часці, вядуць пошукавую работу, вывучаюць гісторыю сваёй краіны, сустракаюцца з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, воінамі-інтэрнацыяналістамі. А на летніх канікулах выязджаюць у лагер, дзе ўдасканальваюць фізічную падрыхтоўку, вучацца страляць. У клуб жадаюць трапіць як малыя дзеці, так і падлеткі. Іх прыводзяць туды самі бацькі. Многія мараць насіць афіцэрскія пагоны. Але няважна, кім яны стануць. Тыя навыкі, якія яны атрымліваюць, спатрэбяцца ім у жыцці.

Значную і цікавую гісторыка-краязнаўчую і валанцёрскую дзейнасць ажыццяўляюць выхаванцы эколага-патрыятычнага клуба «Нашчадкі».

Мы імкнёмся не проста расказаць падрастаючаму пакаленню, што такое патрыятызм, але і паказаць ім адданасць Радзіме, дзяржаўным сімвалам на асабістым прыкладзе. Абнавілі алею памяці воінаў-«афганцаў» Мінскай вобласці, залажылі алею ў гонар загінулых крупскіх воінаў-«афганцаў» з сямі ніцых ракіт.

— Анатоль Станіслававіч, на вашу думку, замацаванне маладых спецыялістаў і рабочых залежыць ад сацыяльна-эканамічнага становішча раёна?

— Вядома, моладзь хоча добра зарабляць, дастойна жыць. Адкрыццё новых прадпрыемстваў, павышэнне зарплаты ўплывае на яе светапогляд. За апошнія два-тры гады мы адкрылі пасля мадэрнізацыі завод «Амкадор-Можа». Мы яго практычна перарабілі, увялі найноўшае абсталяванне, камп'ютарную сістэму, робатаў. Тут працуе больш за 200 чалавек, ахвотна прыехалі маладыя спецыялісты.

Там, дзе працуе эканоміка, як вядома, застаецца і моладзь.

— Маладым неабходныя не толькі работа і дастойная зарплата, але і ўласны дах над галавой.

— Мы штогод уводзім у эксплуатацыю пяць з паловай тысяч квадратных метраў жылля. Гэта звычайна адзін 40-кватэрны або 60-кватэрны дом. Для нашага горада, дзе пражывае каля 8,8 тысячы чалавек, гэтага дастаткова. Такія тэмпы ўтрымліваем на працягу апошніх трох-чатырох гадоў. Жыллё ў асноўным прызначана для шматдзетных сем'яў. На наступны год запланаваны 60-кватэрны шматпавярховік з долевым удзелам лясгаса для сваіх работнікаў.

Разглядаецца перспектыва ўзвядзення новай школы, фізкультурна-аздараўленчага комплексу. Летась увялі адзін стадыён са штучным пакрыццём. У планах яшчэ адзін такі спартыўны аб'ект, больших памераў.

У сельскай гаспадарцы таксама адбываецца шмат змен. Каля вёскі Дворышча агракамбінат «Дзяржынскі» ўзводзіць вытворчую пляцоўку, новыя птушнікі.

Змяніў свой выгляд мікрараён Цыганы ў саміх Крупках, стаў больш камфортным для жыцця. Раней ад людзей паступала шмат скаргаў па добраўпарадкаванні. Асфальтуем і рамантуем дарогі ў новым мікрараёне Паўночны. Словам, развіццё ідзе па ўсіх кірунках.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ,
г. Крупкі.

АЛЕРГІЮ — ПАД КАНТРОЛЬ

Цэнтр імуналогіі і алергалогіі будзе створаны ў Акадэміі навук Беларусі

Ён будзе функцыянаваць у складзе Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі НАН. Мэта стварэння новай навуковай структуры — комплекснае вывучэнне фарміравання і механізмаў функцыянавання імунітэту жывых арганізмаў на малекулярна-клетачным узроўні ў норме і пры паталогіях, распрацоўка інавацыйных спосабаў дыягностыкі і лячэння хвароб, асацыіраваных з парушэннем функцыянавання імунітэту ў інтарэсах медыцыны і сельскай гаспадаркі.

Створаны Цэнтр імуналогіі і алергалогіі дапоўніць спектр дзейнасці інстытута і дасць магчымасць выконваць фундаментальныя даследаванні ў галіне вірусалогіі і стварэння новых вакцын на высокім метадычным узроўні, а таксама вырашаць складаныя навукова-практычныя задачы ў галіне медыцыны, біялогіі і сельскай гаспадаркі.

З 2022 года Цэнтр імуналогіі і алергалогіі прыступіць да распрацоўкі інавацыйных метадаў дыягностыкі алергіі неадкладнага і запаволенага тыпу на шырокі спектр алергенаў і да стварэння ўчастка па імуна- і алергадыягностыцы, што істотна пашырыць дзейнасць інстытута. У інтарэсах сельскай гаспадаркі ў цэнтры будуць праводзіцца даследаванні, накіраваныя на вывучэнне біялагічных механізмаў узаемадзеяння патагенных грыбоў і вірусаў з клеткамі раслін з мэтай распрацоўкі новых імунамадулюючых прэпаратаў, стварэння экалагічна чыстых сродкаў аховы і прафілактыкі інфекцыйных захворванняў сельгасгаспадарчых раслін.

Для правядзення неабходных даследаванняў Інстытут біяфізікі і клетачнай інжынерыі НАН Беларусі мае высокакваліфікаваныя кадры з вопытам работы ў галіне эксперыментальнай і клінічнай імуналогіі, клетачнай імунатэрапіі і алергалогіі. Цяпер дзейнасць Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі НАН Беларусі ў галіне імуналогіі і алергалогіі накіравана на распрацоўку метаду клетачнай імунатэрапіі алергічнага рыніту, аказанне медыцынскіх паслуг па дыягностыцы лекавай алергіі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ЗША задумаліся аб адмове наносіць ядзерны ўдар першымі

Адміністрацыя ЗША правядзе серыю сустрэч у закрытым фармаце, якія будуць прысвечаны змене дзеючай ядзернай палітыкі. У прыватнасці, чыноўнікі абмяркуюць пераход да прынцыпу непрымянення ядзернай зброі першымі. Аб гэтым піша The Washington Post.

Кансультацыі, якія пачнуцца ў лістападзе, стануць часткай стратэгіі адміністрацыі прэзідэнта Джо Байдэна па выпрацоўцы новай палітыкі ў дачыненні да ядзернай зброі. Дзяржаўныя чыноўнікі думаюць адмовіцца ад нанясення ядзернага ўдару першымі ў выпадку небяспекі. Як варыянт, Вашынгтон павінен прытрымлівацца палітыкі стрымлівання.

Сам Байдэн падтрымліваў ідэю абнавіць стратэгію ЗША ў дачыненні да ядзерных узбраенняў. Больш за тое, у 2017 годзе ён ставіў пад сумненне ідэю аб тым, што амерыканскаму боку калісьці спатрэбіцца наносіць ядзерны ўдар першым.

Еўропу абвінавацілі ў пагаршэнні праблем з мігрантамі

У тым, што паток мігрантаў у краіны Еўрасаюза ўзмацніўся і стаў некантралюемым, вінаватыя еўрапейскія палітыкі, якія толкам не спрабавалі вырашыць гэтую праблему, сказаў доктар Надэр Талебі з Берлінскага інстытута эмпірычнай інтэграцыі і даследаванняў міграцыі.

На думку эксперта, многія еўрапейскія палітыкі бачаць у бежанцах патэнцыйных злачынцаў, на што ўказваюць іх рэзкія заявы. «У дзяржаў Еўропы ёсць доўгая і сумная гісторыя, звязаная з краінамі Афрыкі і Блізкага Усходу, калі тыя былі калоніямі. І ў Еўрасаюзе так і не пазбавіліся ад каланіяльнага мыслення, у адпаведнасці з якім мігранты — гэта пагроза», — мяркуе Талебі.

Эксперт таксама абвінаваціў палітыкаў Еўрасаюза ў вялізных тратах на ўзмацненне бяспекі на граніцах. На яго думку, такія меры ніяк не вырашаюць праблем, з-за якіх жыхары краін Блізкага Усходу і Афрыкі вымушаныя бегчы ў Еўропу: у прыватнасці, гэта не прадухіляе эканамічнага крызісу і не спыняе войн.

У Афганістане загінуў камандуючы сіламі талібаў

Адзін з камандуючых сіламі талібаў у Кабуле загінуў пасля атакі на ваенны шпіталь у Афганістане, паведамляе РІА «Навіны».

Па даных агенцтва «Франс Прэс», гаворка ідзе пра Хамдулу Махліса. Талібы адмаўляюць яго гібель. Раней відавочца паведаміў РІА «Навіны», што ў аўторак група тэрарыстаў трапіла ў будынак медустановы, у якой адбыліся выбухі. Пасля там пачаліся сутыкненні з талібамі. Па словах суразмоўніка агенцтва, загінулі 23 чалавекі, пацярпелі 50. Адказнасць за тэракт узяла на сябе тэрарыстычная групоўка «Ісламская дзяржава».

АСАБЛІВАЕ МАЛАКО АД АДБОРНЫХ КАРОЎ

і не толькі...

Беларускае — значыць якаснае і натуральнае. Гэта чарговым разам пацвярджае найбуйнейшая ў нашай краіне харчовая выстаўка-кірмаш «ПрадЭкспа», якая пройдзе ў Мінску з 9 да 12 лістапада.

За 27 гадоў работы гэтая міжнародная выстаўка стала адной з галоўных падзей для вытворцаў прадуктаў харчавання, пастаўшчыкоў і рытэйлераў з розных краін свету, адзначыў на прэс-канферэнцыі **намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Аляксей БАГДАНАЎ.** Ён адзначыў, што аграрыі падышлі да мерапрыемства з добрымі паказчыкамі па экспарце.

За 9 месяцаў бягучага года быў павялічаны экспарт прадуктаў харчавання на 12,6 %. Паводле аператыўных даных «Белстата», за студзень—верасень бягучага года экспарт беларускага харчавання значна вырас і склаў больш як 4,7 млрд долараў. За 8 месяцаў гэтага года быў рост на 10,8 %, адпаведна, дынаміка палепшылася на 1,8 %. Паступленне валютнай выручкі за 9 месяцаў павялічылася на 529 млн долараў. «Такім чынам, Беларусь працягвае ўпэўнена нарошчваць пастаўкі ў іншыя краіны свету», — канстатаваў Аляксей Багданаў.

Намеснік міністра адзначыў, што сёлета растуць пастаўкі ва ўсе краіны і рэгіёны, уключаючы як СНД, так і далёкае замежжа. А асноўнымі аддаленымі рынкамі, якія працягваюць актыўна расці, з'яўляюцца Азіяцкі рэгіён і краіны Еўрапейскага саюза.

Асобна Аляксей Багданаў закрануў і тэму малочнай прадукцыі. Так, летась Беларусь адправіла на экспарт 4,8 млн тон малочнай прадукцыі, заняўшы ў дадзеным сегменце чацвёртую пазіцыю ў свеце пасля ЕАЭС, Новай Зеландыі і ЗША. Малочная перапрацоўчая прамысловасць нашай краіны прадстаўлена 35 прадпрыемствамі, якія перапрацавалі ў 2021 годзе 7,8 млн тон малака. Малочная прадукцыя пастаўляецца ў 58 краін свету.

Прэзентацыі, конкурсы і гастратуры

Найбуйнейшая ў краіне харчовая выстаўка будзе доўжыцца чатыры дні. Па словах **начальніка ўпраўлення выставак і кірмашоў Нацыянальнага выставачнага цэнтра «БелЭкспа» Вікторыі АГАФОНАВАЙ**, першы дзень, 9 лістапада, выстаўка будзе працаваць выключна ў рэжыме бізнес-кантактаў, калі на тэрыторыю цэнтра змогуць трапіць толькі прадстаўнікі дзелавых колаў і прадпрымальнікаў па спецыяльных запрашальных білетах і папярэдняй рэгістрацыі. Другі і трэці дзень — свабодны ўваход для ўсіх жадаючых, хто пройдзе нескладаную рэгістрацыю або купіць квіток за сімвалічную суму.

Сёлета звыш 100 удзельнікаў прадставяць на выстаўцы найлепшыя ўзоры прадуктаў харчавання, напояў, найноўшыя дасягненні і тэхналогіі сферы. Прэзентуюць свае магчымасці і замежныя кампаніі. У шырокім асартыменце будуць прадстаўлены прадпрыемствы адразу некалькіх рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі. Спецыяльныя экспазіцыі будуць у Пензенскай, Камчацкай, Бранскай, Маскоўскай і Омскай абласцей, Санкт-Пецярбурга, Прыморскага краю і іншых.

Маштабу экспазіцыі адпавядае і не менш насычаная дзелавая праграма выстаўкі. Пройдуць галіновыя форумы, канферэнцыі, прэзентацыі, конкурсы, агляды і чэмпіянаты.

363 цуда-каровы

У гэтым сезоне на выстаўцы будзе прадстаўлена свая «разыначка». Стварылі яе ў Брэсцкай вобласці. Лунінецкі малочны завод прэзентуе навінку года — малако «А2», якое з'яўляецца перспектыўным інавацыйным прадуктам, заявіў Аляксей Багданаў.

Намеснік міністра распавёў, што малако «А2» — гэта сумесная распрацоўка навукоўцаў і тэхнолагаў. На смак яно не адрозніваецца ад звычайнага, галоўная перавага — у саставе. Прадукт добра засвойваецца, не выклікае запаленчых працэсаў, умацоўвае імунітэт, падыходзіць як дзецям, так і пажылым людзям.

Усім нам з дзяцінства казалі, што малако — самы карысны для арганізма чалавека прадукт. Але мала хто ведае, што ў больш чым 25 % насельніцтва Зямлі непераноснасць бялку бэта-казеіну — А1. Менавіта для такіх людзей на Лунінецкім малочным заводзе запусцілі новую лінію па вытворчасці малочнай прадукцыі «А2». У ёй з двух варыянтаў бялку вытворца выкарыстоўвае толькі бяспечны. Малако «А2» з прычыны спецыфікі геннага саставу мае нізкую алергеннасць і высокую засваяльнасць для чалавека. Таму новы кірунак у Беларусі і асвойваецца.

Пакуль на гэтым заводзе існуе лінейка з чатырох відаў: малако, кефір, смятана і біяёгурты без цукру на аснове малака «А2».

Важны кампанент — бэта-казеін «другога» тыпу — атрымліваюць ад кароў з адборнымі генамі. Больш за год навукоўцы правяралі жывёлу па ДНК-тэхналогіі для вызначэння генатыпа. Пасля ў Лунінецкім раёне стварылі ўласнае пагалоўе, дзе ўсе каровы маюць спецыяльны сертыфікат прыдатнасці да вытворчасці малака «А2». У нашай краіне адборны статак складаецца з 363 кароў.

Аляксей Багданаў падкрэсліў, што дадзены кірунак досыць перспектыўны. Паводле яго слоў, сусветны абарот малочнай прадукцыі «А2» на сённяшні дзень складае не больш за 1 мільярд долараў. Паводле ацэнак экспертаў, да 2027 годзе ён дасягне 4 мільярдаў.

Сяргей КУРКАЧ.

ЗАПАС БЯДЫ НЕ ЧЫНІЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На важнасць фарміравання стабілізацыйнага фонду для кантролю сітуацыі на спажывецкім рынку і росту цэн на пладова-агароднінную прадукцыю ў міжсезонне на нарадзе з кіраўніцтвам Савета Міністраў 22 кастрычніка звярнуў увагу Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка: «Стабілізацыйныя фонды мы з савецкіх часоў выкарыстоўваем як рэзерв для згладжвання скачкоў цэн і стабільнага насычэння спажывецкага рынку ў міжсезонны перыяд. Гэта значыць, капуста, бульба, морква, буракі і іншае (тое, што мы закладваем у сховішча) — гэта для таго, каб забяспечыць нашых людзей у восеньска-зімовы перыяд, пакуль не з'явіцца новы ўраджай. Зрабіце так, каб гэтых прадуктаў хапіла!»

На Гомельшчыне ў адпаведнасці з рашэннем аблвыканкама сёлета ў стабфонды закладваецца звыш сямі з паловай тысяч тон бульбы, 10 тысяч тон агародніны, больш як паўтары тысячы тон яблыкаў.

Кіраўніцтва рэгіёна паставіла задачу сфарміраваць пладова-агароднінны запас у вобласці пад поўную патрэбнасць. Так, менавіта стабфонды гарантавана забяспечаць гароднінай і садавіной айчыннай вытворчасці ўсе сацыяльныя ўстановы — бальніцы, школы, дзіцячыя садкі, дамы састарэлых.

Між тым, аб'ёмы закладкі запасаў вызначаны з улікам попыту на свежую пладова-агароднінную прадукцыю ў міжсезонны перыяд на ўнутраным рынку. Улічаны

Нарыхтоўка гародніны ў ААТ «Камбінат «Усход».

ў тым ліку і рэальныя ўмовы для забеспячэння захаванасці запасаў. Стабфонды сфарміруюць пераважна сельгасвытворцы (ад 15 да 30 % атрыманага ўраджаю агародніны) і арганізацыі гандлю, якія заключылі дагаворы на пастаўку прадукцыі з сельгасарганізацыямі і фермерскімі гаспадаркамі. Па статыстыцы аб'ёмы запасаў у стабфондах перавышаюць попыт на прадукцыю, таму жыхары рэгіёна будуць забяспечаны ў поўным аб'ёме.

Як было адзначана ў галоўным упраўленні гандлю і паслуг аблвыканкама, прадукцыю на міжсезонне размесцяць у 28 сховішчах. Усе яны прайшлі атэстацыю. Асноўную частку стабфонду размесцяць на складах сельгаскамбінатаў «Усход», «Цяплічнае», «Брылёва», Мазырскай і Светлагорскай агароднінных фабрык, фермерскай гаспадаркі «Яблыневы сад», Гомельскага абласнога спажыўтаварыства.

КСУП «Цяплічнае» — адно з сельгаспрадпрыемстваў, што робіць свой унёсак у фарміраванне стабфонду ў рэгіёне. Аграрыі актыўна развіваюць агародніцтва ў цяпліцах і ў адкрытым грунце.

— Увосень мы жывём па «двайным» графіку: адзін дзень займаемся выбаркай цяплічнай гародніны, а на другі — адпраўляемся ўбіраць ураджай, які вырасцілі ў адкрытым грунце, — аб наладжанай у гаспадарцы рабоце распавяла **аграном Таццяна РАМАНАВА**. — Работнікі з іншых падраздзяленняў таксама часова мяняюць асноўны профіль і дапамагаюць на пераборцы гародніны ў сховішчах.

У гаспадарцы нормы закладкі гародніны ў стабфонд у асноўным засталіся на ўзроўні мінулага года, а па цыбулі і бураках — нават сталі вышэйшыя. Прадукцыя КСУП «Цяплічнае», закладзеная ў стабфонд, будзе адпраўляцца на прадпрыемствы грамадскага харчавання, якія абслугоўваюць школы, бальніцы, іншыя сацыяльныя аб'екты, а таксама ў гандлёвую сетку. Каб гародніна захавалася да будучага ўраджаю, створаны ўсе неабходныя ўмовы.

— Прадукцыя са стабфонду адгружаецца планамерна, па загадзя распрацаваным графіку. Таму магчымасць таго, што нейкі від гародніны «знікне» ў выніку ажыятажнага попыту, выключана, — запэўніваюць у гаспадарцы.

Сярод галоўных «захавальнікаў» раслінная прадукцыі для патрэб жыхароў абласнога цэнтра — сельгаскамбінат «Усход». Запасы ў гаспадарцы чакаюць свайго спажыўца ў сховішчах для гародніны і халадзільных камерах пры строгім захаванні тэмпературнага рэжыму. Гэта гарантыя, падкрэсліваюць гомельскія аграрыі, што прадукцыя не сапсуецца, а ад таго, ці даляжыць гародніна да наступнага года, будуць залежаць і цэны. Увесну крамы традыцыйна пачынаюць гандляваць імпартным, а стабфонды дапамагаюць рэгуляваць сітуацыю на рынку.

У халадзільныя камеры на працягае захоўванне капуста, бульба, лук, морква і бурак адпраўляюцца пасля ачысткі, сартавання і прасушкі. Дарэчы, на асаблівым кантролі ў сельгасвытворцаў — якасны падыход да сарціроўкі і каліброўкі стратэгічна важных запасаў. **Начальнік складоў захоўвання камбіната «Усход» Надзея ГУЦАВА** адзначае:

— Гэта вельмі працаёмкі працэс, бо, хоць і ёсць і абсталяванне, частка такога грузу праходзіць праз рукі. Мы імкнёмся максімальна не траўміраваць гародніну і залажыць яе, як належыць.

На Гомельшчыне фарміраванне стабілізацыйнага фонду з прадукцыі айчыннай вытворчасці плануюць завяршыць да сярэдзіны лістапада.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Добрая справа

АРШАНСКІЯ ЭНЕРГЕТЫКІ ШТОДЗЕНЬ ГАТУЮЦЬ АБЕДЫ МЕДЫКАМ ГАРБАЛЬНІЦЫ

Філіял «Цяплічны» РУП «Віцебскэнерга» пачаў гатаваць і дастаўляць у Аршанскую гарадскую бальніцу № 1 імя Сямашкі бясплатныя абеды для медыкаў, якія працуюць у так званай чырвонай зоне. Работнікі сталовай «Цяплічнага» прыходзяць на работу ў 6 раніцы, каб да 12.00 ежа была ў медыцынскіх работнікаў. Штодзень яны гатуюць каля 120 абедаў.

«Ужо трэці тыдзень у сталовай робім для медработнікаў гарачыя абеды. Кожны дзень новае меню, разнастайнае і збалансаванае, заўсёды таксама прысутнічаюць выпечка, салаты са свежай гародніны і сокі ўласнай вытворчасці. Абеды пакуюцца ў спецыяльныя тэрмакантэйнеры. Усе ведаюць, якая адказнасць ускладзена на ўрачоў і як ім зараз складана, таму важная падтрымка», — адзначыла **загадчыца гандлёвым аб'ектам «Арэхаўск» філіяла «Цяплічны» Наталля КАСАЧОВА**. Аналагічную дапамогу аказвалі энергетыкі і ў мінулым годзе, накіроўваючы вясной гарачыя абеды медыкам трох устаноў аховы здароўя Аршанскага раёна.

Медыкам гарбальніцы імя Сямашкі такая дапамога вельмі дарэчы. «Прыходзячы ў «чырвоную» зону ў 8.00 і вяртаючыся адтуль у 20.00, няма магчымасці нармальна паесці або схадзіць купіць ежу. Таму тое, што зараз «Цяплічны» прывозіць харчаванне ў саму бальніцу, для нас вельмі зручна. Асобная падзяка за тое, што гатуюць абеды і ў выхадныя дні», — сказалі медработнікі.

Сямейная газета

Выпуск № 20 (179)

КАВАВАЕ СПАТКАННЕ,

ці Як зберагчы адносіны ў шлюбе

Той месяц быў няпросты: адаптацыя дзяцей да школы пасля летніх канікул, мы з мужам Аляксандрам пасля водпуску і без грошай стараліся зарабіць больш і практычна не бачыліся. Нашы зносіны перайшлі ў тэлеграм-чат і там зводзіліся да пастаноўкі задач і пошуку іх рашэння на карысць сям'і. Муж сыходзіў з дому раніцай, а прыходзіў, калі я і дзеці ўжо спалі.

Мы стараліся не маркоціцца. Саша час ад часу пакідаў мне салодкія сюрпрызы ў халадзільніку і жартаваў, што жанаты на спячай прыгажуні. Я ж гатавала на вячэру яго любімыя стравы, якія ён мог пакаштаваць, на жаль, ужо толькі халоднымі. Неўзабаве сэрцы нашы ўзбунтаваліся, і мы вырашылі, што б там ні было, выпіць кавы з раніцы разам. Для гэтага мне трэба было ўстаць на гадзіну раней, а мужу выйсці на работу на паўгадзіны пазней. Наш тэлеграм-чат заціх, адкладваючы ўсе нявырашаныя пытанні на час кававага спаткання. Але сямейнае жыццё па-ранейшаму бурліла. Днём мне патэлефанавалі са школы і расказалі пра далёка не ўзорныя паводзіны дзесяцігадовай дачкі Улі. Аказалася, у гэты дзень у яе была кантрольная па матэматыцы, і яна доўга адмаўлялася аддаваць сшытак настаўніку. Ужо ўвечары, успамінаючы аб гэтым, Уля гучна плакала. Ёй хацелася атрымаць высокую адзнаку, але два выкананыя заданні з пяці абяцалі максімум шасцёрку. Я сядзела побач з малой і гаравала разам з ёй амаль гадзіну. Потым мы прыдумлялі, як выправіць адзнаку, як у наступны раз больш спакойна рэагаваць на няўдачу. Нашу гутарку перапыніў сын Мішка. Ён быў абураны паводзінамі пяцігадовай сястры Меланні, якая ціхенька заходзіла да яго ў пакой, пакуль ён рабіў урокі, і спачатку выносіла катоў, якія мірна спалі ў яго на ложку, потым знесла яго падушку, далей коўдру, у рэшце рэшт прыйшла чарга заплечніка, з якога пачалі знікаць сшыткі і кнігі — усё гэта суправаджалася гучным смехам з аднаго боку і не менш гучным лямантам з іншага. Калі Мішкава цярпенне скончылася, ён прыйшоў да мяне, патрабуючы тэрміновай расправы над шкоднікам. Мелаша пакорліва вярнула яму ўсе рэчы і нават спрабавала (беспаспяхова) прымусіць катоў зноў легчы на Мішаў ложак.

Было зразумела, што ёй хацелася ўвагі. Прапанавала малой разам прыгатаваць вячэру. Мелаша так старанна рэзала памідоры на салату, што незнарок параніла пальчык. Ранку апрацавалі, слёзы выцерлі, салацік дарабілі. Неўзабаве мы ўсе павячэралі і сталі ўкладвацца спаць. І калі малыя ўжо былі ў ложку, я раптам усвядоміла, што сямнаццацігадовая дачка Аляксандра вернецца позна, толькі каля адзінаццаці. Яна вучыцца і падпрацоўвае ў кафэ, а сёння якраз яе змена. Разумела, што раніцай у мяне кававае спаткання з мужам, але не дачакацца дачкі не магла... Ужо скрозь сон я пачула, як муж вярнуўся з работы, але сіл устаць не было.

Я прачнулася ад святла ліхтарыка, накіраванага мне ў твар.

— Маааам, у мяне праблемы... Не магу заснуць. У мяне нейкія плямы на баку. А раптам гэта лішай?

Я вылезла з ложка, і мы крадком прабраліся на кухню. Там уключылі святло і сталі разглядаць плямкі на скуры.

— Я не дэрматолаг, але гэта больш падобна на тое, што ты пераціснула рамянём сваё далікатнае цельца.

— Але я пераапранулася ўжо даўно, а яно не праходзіць.

— Давай так: да раніцы не пройдзе — пойдзем да лекара...

Я паглядзела на гадзіннік. Была палова другой ночы.

— Не хвалюйся, думаю, нічога страшнага. Хутчэй за ўсё раніцай плямак не будзе.

Мы разышліся па пакоях. Я толькі пачала засынаць, як раптам пачула ўсхліпванне, якое даносілася з Улінага пакоя. Яна высокачуллівае дзіця, і, відаць, у выніку перажытага падчас кантрольнай стрэсу ёй прысніўся кашмар. Супакоіўшы дачушку, вярнулася ў спальню. Паглядзела на соннага мужа і падумала, што раніцай за кубачкам кавы пажартую, што зараз па праве магу звацца жонкай спячага прыгажуна.

Праз гадзіну Мелаша захацела ў прыбіральню, а потым папіць вады. Калі малая зноў была ў ложку, гадзіннік паказваў палову пятай раніцы. Праз паўгадзіны сустрэча. Можа, не класціся... Не, крышачку паляжу.

На наступны дзень чат зноў ажыў. Муж клікаў з мяне, што паўгадзіны патрацію на спробы ўгаварыць мяне падняцца і выпіць з ім кавы. Я згаджалася, абяцала ўстаць праз хвіліну, але... так і не ўстала.

— Ці згодна ты выпіць са мной кавы заўтра?

— Так, калі толькі раптам...

— Не турбуйся, я на заўтра ўзяў выхадны, каб быць упэўненым, што ні ў цябе, ні ў мяне не ўзнікне «толькі раптам».

У нашым жыцці было і яшчэ будзе шмат спатканняў, кароткіх і доўгіх, рамантычных і не вельмі, разам з дзецьмі і без іх. Галоўнае — здолець зберагчы гэта ўтульнае жаданне — выпіць кавы разам.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Тыя, хто побач

Крыніца іх натхнення

Алесь і Юлія Шацілы — прадстаўнікі сферы культуры ў другім пакаленні. Яны сябры Беларускага саюза мастакоў. Алесь Пятровіч — скульптар. Працуе старшым выкладчыкам на факультэце архітэктуры БНТУ і навуковым супрацоўнікам Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. Яго маці Тамара Сяргееўна Шаціла доўгія гады кіравала народнай выяўленчай студыяй у Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, а бацька Пётр Дзмітрыевіч працаваў там жа мастаком-афарміцелем. Юлія Уладзіміраўна — мастак-графік. Яна намеснік дырэктара Дзіцячай мастацкай школы № 3 Мінска і заснавальнік творчай майстэрні «Залаты птах». Юлія — старэйшая дачка беларускага пісьменніка Уладзіміра Ягоўдзіка. Яе мама Марыя Рыгораўна шмат гадоў паспяхова займалася кнігавыдавецтвам. У Алеся і Юліі трое дзяцей: старэйшаму Міхасю — 18, Зосі — 13, Адаму — 6.

(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)

Фота Вольгі ПАКЛОНСКАЙ.

Алесь, Юля, Зося, Адам...

Старэйшы сын Міхась.

Мастакі Алесь і Юлія ШАЦІЛЫ лічаць, што два творчыя чалавекі на адну сям'ю — гэта не шмат

Бацькоўскі сход

ПЕРНІКАВЫ ДОМІК,

або У чым небяспека гіперапекі?

У любога медаля ёсць два бакі. І любая пазітыўная з'ява, даведзеная да абсурду, мяняе «зарад» з плюса на мінус. Чым небяспечны для дзяцей клопат з прыстаўкай «гіпер»?

Дырэктар аднаго з сельскагаспадарчых прадпрыемстваў распавёў такую гісторыю. У гаспадарцы ёсць сям'я: абодва, і муж і жонка, — выдатныя работнікі і клапатлівыя бацькі. Сям'я лічыцца шматдзетнай — у ёй трое дзяцей, прычым адно ўсыноўленае. І вось здарылася так, што ў мамчын выхадны дзень ёй раптам прыйшлося на паўдня выйсці на работу. У адсутнасць мамы і таты сям'ю наведала сацыяльная служба і забіла трывогу: дзеці дома адны!

— А старэйшай дзяўчынцы, між іншым, 12 гадоў, — кажа суразмоўца. — Малодшаму сыну — чатыры, сярэдняй дачцэ — дзесяць. Абедзве старэйшыя сястры цалкам у стане некалькі гадзін паглядзець за малодшым братам. Справа адбывалася не на далёкім хутары, а ў аграгарадку, у сучасным доме. Я, вядома, тут жа пад'ехаў туды і супакоіў прадстаўнікоў сацыяльных службаў. Але, шчыра кажучы, мне здаецца, з апекай над дзецьмі цяпер перабіраюць.

Мой суразмоўца быў чалавекам досыць сталага ўзросту, таму далей чакана пачалося: «Вось у наш час...» — аб тым, што 30—40 і больш гадоў таму дзеці хадзілі ў школу пешшу за некалькі кіламетраў, іх не падвозілі на спецыяльным аўтобусе, і ўсе былі жывыя-здаровыя і выраслі добрымі людзьмі... Згадайце, каму ў дзяцінстве бабулі і дзядулі не распавядалі класічную гісторыю, як хадзілі ў школу лютай зімой праз лес?.. І ўсе ведаюць, што гэтую інфармацыю варта «дзяліць на сем»: не 12 кіламетраў, а два-тры, і не ў -30, а ў -1. І ўсё ж аб гіперапецы як аб адной з прыкмет нашага часу кажуць не толькі пажылыя людзі, але і спецыялісты — педагогі і псіхолагі. Многія з іх называюць глабальную гіперапеку, у якой растуць сучасныя дзеці, сур'ёзнай небяспекай.

(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)

Тэхналогіі — для дзіцячага здароўя

Работу цэнтраў ранняга ўмяшання неабходна развіваць паралельна з тым, як развіваюцца тэхналогіі і з'яўляюцца новыя методыкі. Аб гэтым паведаміла на прэс-канферэнцыі «Здароўе дзіцяці сёння — здаровая нацыя заўтра. Аб рэалізацыі Нацыянальнай стратэгіі ўмацавання здароўя дзяцей і падлеткаў у Рэспубліцы Беларусь» прадстаўнік ЮНІСЕФ у Беларусі Таццяна РАДАЧАЙ.

Яна спынілася на асноўных напрамках стратэгіі, уклад па якіх аказаўся самым значным. Так, Міністэрства аховы здароўя і ЮНІСЕФ у Беларусі пры падтрымцы іншых партнёраў прыклалі шмат намаганняў для ўмацавання здароўя і развіцця дзяцей ранняга ўзросту. Размова ідзе аб удасканаленні сістэмы догляду нованароджаных і прадухіленні траўматызму.

«Асабліва хачу падкрэсліць дасягненні сістэмы ранняга ўмяшання. Мы сумесна з партнёрамі, перш за ўсё — Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны, а таксама пры донарскай падтрымцы Расійскай Федэрацыі, — працавалі над стварэннем сеткі цэнтраў ранняга ўмяшання па ўсёй краіне. Усяго іх створана 38. Гэтыя цэнтры структураваныя такім чынам, каб аказваць максімальную падтрымку дзецям да 3 гадоў, якія маюць пэўныя рызыкі і ўразлівасці ў частцы развіцця. Цэнтры нацэлены на тое, каб даць дзецям магчымасць пераадолець складанасці на ранніх жыццёвым этапе, жыць паўнацэнным і актыўным жыццём, быць інтэграванымі ў сістэму адукацыі. Кожны цэнтр абслугоўвае каля 10 тысяч дзяцей штогод, — расказала аб выніках Таццяна Радачай. — Лічу, што нам і нашым партнёрам трэба прадаўжаць работу па цэнтрах ранняга ўмяшання. Гэта сістэма павінна развівацца паралельна таму, як развіваюцца тэхналогіі, з'яўляюцца новыя метады і тэхнічныя магчымасці. Важна, каб усе дзеці Беларусі маглі скарыстацца новымі магчымасцямі, якія з'яўляюцца».

Па словах прадстаўніка ЮНІСЕФ у Беларусі, усе 38 цэнтраў прайшлі працэдуру ліцэнзавання — іх правяралі па аб'ёме крытэрыяў. І маніторынг узроўню аказання паслуг працягваецца.

Таксама Таццяна Радачай звярнула ўвагу на неабходнасць і далей супрацоўнічаць з Міністэрствам аховы здароўя ў падтрымцы грудного кармлення сярод маці Беларусі. Яшчэ яна высока ацаніла дасягненні Беларусі ў вакцынацыі дзяцей: у нашай краіне захаваны графік прышчэпак, гэта планавая і рэгулярная практыка. Бацькам даецца шмат інфармацыі і тлумачэнняў, чаму гэта важна.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

ПЕРНІКАВЫ ДОМІК

КЛОПАТ ЯК ЭГАІЗМ

Вядомы канадскі псіхолаг Джордан Пітэрсан стварыў шэраг работ, прысвечаных феномену гіперапекі, і нават напісаў пра гэта кнігу, якая выклікала неадназначную рэакцыю. Спецыяліст выкладаў у вядучых універсітэтах свету і назіраў за студэнтамі, іх паводзінамі і стаўленнем да жыцця. І яго выснова: ужо сёння прычына жыццёвых праблем многіх маладых людзей — няправільнае выхаванне. Дакладней, гіперапека. А наступным пакаленням прыйдзецца яшчэ цяжэй.

Вельмі многія сучасныя маці не пераразаюць «псіхалагічную пупавіну» са сваім дзіцем, нават калі тое становіцца дарослым.

— У сучасным грамадстве дзяцей пастаянна абараняюць ад чагосьці складанага і дыскамфортнага, — адзначае псіхолаг, называючы гэта «ўцёкамі ў бяспечную зону». — Гэта галоўная прычына ўразлівасці розуму і эмоцый. Таму маладым людзям сёння не хапае стойкасці ў жыцці, на працы, у адносінах.

«Гэта адбываецца з-за празмерна клапатлівых бацькоў», — канстатуе спецыяліст у адным са сваіх інтэрв'ю на YouTube. Затым эстафету клопату падхопліваюць школы, далей — прафесійныя навучальныя ўстановы або ўніверсітэты. Гэта сацыяльныя нормы і, мабыць, неабходнасць нашага часу, і «гэта робіць нашых дзяцей трагічна непадрыхтаванымі да жыцця», піша ён.

Джордан Пітэрсан кажа пра тое, што цывілізацыя сёння сутыкнулася з «эпідэміяй празмерна клапатлівага выхавання».

— Прычынай таму — культурная з'ява, якую не прынята звычайна разглядаць у кантэксце гэтай праблемы, — падкрэслівае ён.

Гаворка ідзе аб кантрацэпцыі і планаванні сям'і, тлумачыць у сваім інтэрв'ю спецыяліст. Сучасныя сем'і не нараджаюць шмат дзяцей. Адно дзіця, максімум два, тры — ужо рэдкасць. І гэта робіць дзяцей неверагоднай каштоўнасцю. Мы не гатовыя рызыкаваць імі — і гэта нядзіўна. Сучасныя бацькі заводзяць дзяцей значна пазней, чым было прынята яшчэ 50—60 гадоў таму. Калі ў вас дзіця, а вам 18, вы самі яшчэ дзіця. Вы не будзеце празмерна апякаць сына ці дачку, калі вам 18 — вы будзеце жыць самі, кажа ён. Але калі вам 40 і ў вас першае дзіця — «усе яйкі ў адным кошыку», і верагоднасць, што вы будзеце хоць у мінімальнай ступені рызыкаваць гэтым каштоўным чалавечкам, яго душэўным камфортам і фізічнай бяспекай, роўная нулю. У гэтым ёсць мноства плюсоў, але ёсць і велізарныя мінусы: напрыклад, тое, што вельмі многія сучасныя маці не пераразаюць «псіхалагічную пупавіну» са сваім дзіцем, нават калі тое становіцца дарослым. Маці пяці-шасці дзяцей проста фізічна не ў стане забяспечыць ім гіперапеку. А значыць, дзеці будуць канкурыраваць, выхоўваць адзін аднаго, сапернічаць — і ў выніку выйдуць у дарослае жыццё падрыхтаванымі. «Мы хочам стварыць для свайго дзіцяці бяспечную прастору — але ж жыццё небяспечнае», — падкрэслівае прафесар.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— Гэта больш складаная праблема, чым мы думаем. Вы павінны зразумець, што вы небяспечныя для вашага дзіцяці. Вы можаце адпусціць яго ў свет, і яму будзе балюча, адзначае ён. А можаце апякаць — і яму будзе больш балюча пазней, калі яно вырасце. Калі вы ахвяруеце яго кампетэнцыяй і адвагай у імя бяспекі, вы абяззбройваеце яго, і ўсё, што яно зможа рабіць, калі вырасце, гэта прасіць абароны.

Па сутнасці, гіперапека — гэта эгаізм дарослых, адзначае даследчык. Сучасным бацькам псіхалагічна камфортней, калі дзіця жыве «пад шкляным каўпаком». Яшчэ Зігмунд Фрэйд пісаў пра гіперклапатлівую маці — правобраз ведзьмы з казкі аб пернікавым доміку. Дзеці згубіліся ў цёмным страшным лесе, і раптам знаходзяць домік з шакаладу, пернікаў і цукерак. Што можа быць лепш? Але ў пернікавым доміку жыве ведзьма. Клапатлівая і ласкавая, выконваючы ўсе жаданні малых, яна хоча адкарміць дзяцей, каб у рэшце рэшт... з'есці іх.

— Гэта павучальная казка аб празмерна клапатлівым жаночым пачатку, аб гіперапецы, — кажа ў інтэрв'ю спецыяліст. — Псіхааналітыкі падкрэсліваюць: добрая маці абавязкова павінна памыляцца. Гэта геніяльная фраза.

ПРЫХАВАНАЯ ПАГРОЗА

Уявіце сабе дараслага чалавека, які ўсё жыццё шукае сябе і не можа знайсці. Бацькі (якія даўно на пенсіі) займаюцца пошукам працы для яго, увесь час дапамагаюць матэрыяльна, выцягваюць са складаных жыццёвых сітуацый. Пры гэтым чалавек упэўнены, што яму ўсе абавязаны і не цэняць яго неверагодныя вартасці, у яго завышаныя чаканні ад жыцця. Ён не ўмее адстойваць сваю пазіцыю, ставіць перад сабой мэты, не можа даводзіць пачатае да канца... Але нашто ўяўляць — дастаткова азірнуцца вакол. А можа, непрадузята зірнуць на сябе самога?..

Гэта партрэт дзіцяці, выгадаванага ў гіперапецы. Нават траўміруючыя падзеі дзяцінства не так уплываюць на нашу псіхіку, як чаканне, што хтосьці вырашыць праблемы за нас, кажуць дзіцячыя псіхолагі.

— Можна назваць шэраг прыкмет гіперапекі, — адзначае **сямейны псіхолаг, гештальт-тэрапеўт Кацярына АЛЁХІНА**. — Калі ў вас супаў хоць бы адзін або некалькі пунктаў, вам варта задумацца. І памяняць сваё стаўленне да выхавання.

• Вы кідаецеся на дапамогу, нават калі дзіця не просіць.

— Маленькая дзяўчынка на дзіцячай пляцоўцы спрабуе пералезці праз агароджу пясочніцы. Яна захопленая працэсам і не просіць маці аб дапамозе. Але тая, убачыўшы, падбягае, падхоплівае дзіця падпахі і пераносіць унутр пясочніцы. Паўтарыце такія паводзіны 5—10 разоў, і вы атрымаеце атрафію волі дзіцяці. А крыху пазней — агрэсію ў адносінах да вас, гадам да 10—12 — прыступы раздражнення, з якімі, напэўна, прыйдзеце да псіхолага. Таму што пазнанне свету праз самастойнае намаганне — адна з базавых патрэб дзіцяці, і беспакарана пазбаўляць яго гэтага не атрымаецца.

• Не дазваляеце дзіцяці адчуваць негатыўныя эмоцыі

— Яшчэ будучы малым, дзіця спазнае межы сваёй сілы і дасле-дуе свае магчымасці. Малы спрабуе зачыніць ці адчыніць цяжкія дзверы, уціснуць адну цацку ўнутр другой, уставіць ключ у замок, дастаць нешта з высокай паліцы. Калі не атрымліваецца, малое можа разслабацца і закаціць істэрыку — гэта нармальна. Зразумела, маме або тату прасцей дастаць, адкрыць або ўкласці адну цацку ў другую самому — і істэрыка спыніцца. Усе задаволеныя. А яшчэ прасцей — зрабіць гэта «на апярэджанне», не дапусціўшы нават магчымасці негатыву для дзіцяці.

Гэты прынцып — не дапускаць, каб дзіця хвалявалася, — мае мноства праяў. Напрыклад, дзіцяці не распавядаюць пра сумную падзею ў сям'і, і для яго яшчэ шмат гадоў памерлая любімая бабуля можа быць «жывая», проста яна кудысьці «з'ехала». Дзіця аберагаюць ад хатніх спраў — мыцця посуду, прыбірання. Робяць за яго дамашняе заданне, каб ён не атрымаў дрэнную адзнаку.

— Вынік — у дзіцяці ў свядомасці не фарміруецца прычынна-выніковая сувязь: пэўны ўчынак вядзе да пэўных наступстваў. У яго няма адказнасці за свае ўчынкі. А ў дарослым жыцці гэта вельмі небяспечна — і для самога чалавека, і для навакольных.

• Робіце за дзіця ўсё, што сумна або непрыемна.

Дзеці не любяць рабіць тое, што не прыносіць задавальнення. Прыбіраць за сабой або за сваімі хатнімі гадаванцамі, мыць посуд, вучыць урокі... Нармальная рэакцыя дзіцяці — паспрабаваць пераключыць усё гэта са сваіх плячэй на чужыя. А вось згаджацца на гэта бацькам — ужо ненармальна.

— Праблема будзе расці, патрабаванні — станавіцца ўсё больш недарэчнымі. У такой сітуацыі мы атрымліваем уладнага маленькага «пана» (дарослыя губляюць павагу ў яго вачах). А ў далейшым — грэбаванне патрэбамі бацькоў і няздольнасць працаваць дзеля выніку, цяжкасці маральнага выбару і незадаволенасць сабой нават у выпадку знешняга дабрабыту.

• Не дазваляеце памыляцца і прыкладаць намаганні.

«Мне прасцей зрабіць самой, чым чакаць, пакуль зробіць дзіця» — яшчэ адна праява бацькоўскага «клапатлівага эгаізму».

— Сучаснаму чалавеку заўсёды не хапае часу, — кажа суразмоўца. — Дзіця, зразумела, выканае задачу павольней, чым дарослы, і не так добра. Але калі ўвесь час рабіць усё за яго — завязваць шнуркі і зашпільваць гузікі, афармляць лабараторную работу або пісаць сачыненне — дзіця не атрымае магчымасці навучыцца браць на сябе адказнасць.

• Вар'яцееце ад жаху, калі дзіця знаходзіцца не на адлегласці выцягнутай рукі.

— Вельмі часта сучасныя бацькі не пакідаюць дзіця аднаго дома, нават калі таму ўжо споўнілася 10, 12, 14 гадоў, — кажа Кацярына Алёхіна. — Такія бацькі часам нават гуляюць з дарослым дзіцем, каб не адпускаць яго на вуліцу аднаго. Вынік — крайні інфантылізм падлеткаў, якія вырастаюць у інфантыльных дарослых, зусім не здольных жыць без «падпорак» — мамы і таты, сіл у якіх застаецца ўсё менш.

• Не верыце ў сваё дзіця

— Нядаўна мне давялося працаваць з дзяўчынкай, вельмі маленькай, пяшчотнай і мілавіднай, якую праследавалі пастаянныя страхі. Яна сапраўды выглядала гэткай тоненькай «кветачкай», якую пастаянна хацелася аберагаць. Што і рабілі яе мама і тата, дзядуля і абедзве бабулі з ранняга дзяцінства і да падлеткавага ўзросту. Аж да такіх задач, як перасунуць крэсла, размяць пальцамі пластылін або адкрыць пластмасавую накрыўку слоіка з варэннем. Між тым аказалася, што ад прыроды дзяўчынка валодае баявым характарам, што яна смелая і бойкая. Але гіперапека не дае праявіцца такім якасцям, закладзеным у дзіцяці прыродай. І прывучае чалавека быць слабым і кволым. Ды, як вядома, звычка — другая натура.

ЦІ ЁСЦЬ ВЫХАД?

Што рабіць, калі вы зразумелі, што гіперапека — якраз ваша праблема?

— Яшчэ раз прачытайце вышэйапісаныя пункты — і пачынайце дзейнічаць наадварот, — раіць Кацярына Алёхіна.

• Дазвольце дзіцяці рабіць памылкі — упасці, набіць сінякі, разгубіцца, паспрабаваць яшчэ раз.

• Не спяшайцеся з дапамогай, калі бачыце, што дзіця можа вырашыць задачу само.

• Папрацуйце з уласнымі пачуццямі. Выдаліце такія, як жаль і віна. Галоўным пачуццём у адносінах да дзіцяці павінна быць павага.

• Дазвольце дзіцяці паспытаць вынікі сваіх дзеянняў — як пазітыўныя, так і негатыўныя.

• Калі дапамагаеце ў чымсьці — рабіце разам, а не замест.

• Паведамляйце дзіцяці аб сваіх патрэбах. І не забывайцеся на іх самі. «Усё лепшае — дзецям» — не заўсёды апраўданы прынцып.

• Сачыце, каб узнагароды і пахвалы дзіцяці былі заслужанымі, інакш яны абясцэняцца.

• Хваліце за самастойнасць і за намаганні па дасягненні мэты.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Ваша бяспека

КАЛІ ПАДВОДЗІЦЬ ПЕЧКА...

Вясной, пасля завяршэння ацяпляльнага сезона, камунальныя службы і ўладальнікі прыватных дамоў адразу ж пачынаюць падрыхтоўку да новага ацяпляльнага сезона. За гэты перыяд, з вясны да восені, павінны быць праведзены ўсе прафілактычныя і рамонтныя работы, каб пазбегнуць якіх-небудзь надзвычайных сітуацый падчас халадоў.

Аднак пажары з-за няспраўнасці пячнога ацяплення, цеплагенерыруючых агрэгатаў і прылад, на жаль, не рэдкасць.

Раніцай, 21 верасня, у Дзятлаўскі раённы аддзел па НС паступіў званок аб загаранні лазні ў аграгарадку Таркачы. Гаспадар лазні, які запланаваў папарыцца, падпаліў печ, а сам заняўся іншымі справамі. Сусед, выйшаўшы на вуліцу, убачыў, што на ўчастку яго знаёмага з-пад даху лазні выбіваюцца клубы дыму. Калі мужчыны адчынілі дзверы ў лазню, з парыльні ўжо вырывалася полымя.

Паліць печ трэба не менш чым за дзве гадзіны да адыходу да сну. Каб не атрымаць атручэнне чадным газам, нельга зачыняць засланку печы да таго, пакуль вуглі цалкам не перагараць.

Каб паменшыць прыток кіслароду, яны шчыльна зачынілі дзверы і выклікалі ратавальнікаў. Апошнія прыбылі праз некалькі хвілін, а ўвесь гэты час да іх прыезду мужчыны паліваліводой са шланга будаўнічыя канструкцыі. Меркаваная прычына пажару — парушэнне правілаў эксплуатацыі печы і канструктыўная загана цеплагенерыруючых агрэгатаў і ўстановак.

Ратавальнікі рэкамендуюць паклапаціцца аб бяспечным выкарыстанні лазні яшчэ пры яе праектаванні. Мураванне печы варта даваць толькі спецыялісту. Часткі печы і коміна, якія нагараюцца, не павінны межаваць з драўлянымі канструкцыямі, нават калі драўніна апрацавана вогнеахоўным саставам. Рэгулярна праводзьце агляд і рамонт.

8 верасня ў 4 гадзіны раніцы ў цэнтр аператыўнага кіравання Любанскага раённага аддзела па НС з установы аховы здароўя

паступіла паведамленне аб тым, што з папярэднім дыягназам «атручэнне чадным газам» шпіталізаваныя двое грамадзян пенсійнага ўзросту.

Як высветлілася, муж і жонка прапалілі печ і лягліадпачыць, бо адчулі недамаганне. Каля дзвюх гадзін ночы ўвагу суседзяў сямейнай пары прыцягнула пакінутае ўключанае святло ў іх доме. Адчуўшы нядобрае, яны паспяшаліся выклікаць брыгаду хуткай дапамогі. Мужчына і жанчына былі шпіталізаваныя. Папярэдняя прычына здарэння — заўчаснае закрыццё засланкі печы.

Паліць печ трэба не менш чым за дзве гадзіны да адыходу да сну. Каб не атрымаць атручэнне чадным газам, нельга зачыняць засланку печы да таго, пакуль вуглі цалкам не перагараць.

Павучальная гісторыя адбылася з жыхаром вёскі Арэшкавічы Бярэзінскага раёна. На працягу ўсяго дня мужчына паліў печ, як той казаў, як мае быць, некалькі разоў падкідваў дровы. У халодны дзень хацелася цяпла і ўтульнасці. Знаходзячыся ў дварэ, гаспадар заўважыў, што з-пад страхі ідзе дым. Забегшы ў дом, ён убачыў, што на ляжанцы печы тлеюць матрацы. Мужчына схапіў усё з ляжанкі, вынес на вуліцу і выклікаў ратавальнікаў. Як высветлілася, на ляжанцы печы даўно ўтварыліся расколіны, што дало магчымасць полымю выбрацца вонкі. Аднак печку гаспадар працягваў паліць. (А можа, абыдзецца!) Калі б пажар здарыўся ноччу, то нядбайнае стаўленне да пытанняў бяспекі магло б каштаваць чалавечага жыцця.

Печ з расколінай рана ці позна падвядзе свайго гаспадара. Гэта ўсяго толькі пытанне часу. Яшчэ да пачатку ацяпляльнага сезона трэба заладзіць расколіны, адрамантаваць дзверцы, забяспечыць ахову падлогі перадпячным лістом ад распаленых вуглёў. Ачысціць комін ад сажы і пабяліць, што дае магчымасць заўважыць расколіны, калі яны з'явяцца. Паліць печ рэкамендуецца не больш за паўтары гадзіны дварыразы на дзень, каб пазбегнуць яе перапальвання.

Большасці загараняў можна было б пазбегнуць, калі б грамадзяне больш адказна ставіліся да пытанняў пажарнай бяспекі і падрыхтоўкі да ацяпляльнага сезона. Відаць, многія не поўнасцю ўсведамляюць важнасць праблемы. Калісьці людзі дастаткова строга падыходзілі да пытання сістэматычнай і правільнай ачысткі дымавых труб. Выконвалі гэтую работу спецыяльна навучаныя такому рамяству камінары. У 1898 годзе ў Мінску была нават створана трубаачышчальная арцель, якая складалася з майстра і 20 камінараў. На VI Міжнародным пажарным кангрэсе, які праходзіў у 1912 годзе ў Расіі, член Мінскага вольнага пажарнага таварыства С. Штульберц выступіў з дакладам «Трубаачышчальнае пытанне і яго значэнне». На гэтым кангрэсе Мінскае вольнае пажарнае таварыства было ўзнагароджана дыпломам першай ступені «за ўзорную пастаноўку трубаачышчальнай справы ў горадзе, а таксама за стан пажарнага абозу і арганізацыю касы ўзаемадапамогі для пажарных». Такі экскурс у гісторыю дазваляе зразумець, што пажарная бяспека ва ўсе часы з'яўлялася адным з першачарговых пытанняў для захавання жыцця і маёмасці.

Ратавальнікі рэкамендуюць паклапаціцца аб бяспечным выкарыстанні лазні яшчэ пры яе праектаванні. Мураванне печы варта давяраць толькі спецыялісту. Часткі печы і коміна, якія нагараюцца, не павінны межаваць з драўлянымі канструкцыямі, нават калі драўніна апрацавана вогнеахоўным саставам.

Марына ВАСІЛЕЎСКАЯ, галоўны спецыяліст Рэспубліканскага цэнтра прапаганды МНС.

Будзьце пільнымі!

Шукаюць ахвяр праз інтэрнэт

Большасць злачынстваў супраць палавой недатыкальнасці непаўналетніх перайшло ў інтэрнэт. Праваахоўнікі рэкамендуюць бацькам сачыць за кантактамі і гутаркамі дзяцей у сацыяльных сетках і месенджарах. Такая інфармацыя была агучана на пасяджэнні Брэсцкага аблвыканкама.

«Праблему замоўчваць ні ў якім разе нельга. За дзевяць месяцаў гэтага года супрацоўнікі міліцыі Брэсцкай вобласці выявілі 51 злачынства супраць палавой недатыкальнасці або палавой свабоды непаўналетніх. З іх 25 адносяцца да катэгорыі цяжкіх і асабліва цяжкіх. Намі ўстаноўлена 39 дзяцей, пацярпелых ад дзеянняў педафілаў. Па падазрэнні ў гэтых злачынствах праваахоўнікі затрымалі 35 чалавек», — сказаў **першы намеснік начальніка УУС Брэсцкага аблвыканкама Ігар ЖЫГАЛАЎ, паведаміла БелТА.**

Ён звярнуў увагу, што пераважная большасць такіх злачынцаў перайшла ў інтэрнэт. Менавіта ў сетцы часта адбываецца першае знаёмства педафілаў з дзецьмі. Яны рэгіструюць фэйкавую старонку ў сацсетках і ўступаюць у дыялог з патэнцыйнай ахвярай.

«Універсальных прыкмет у педафілаў няма, распазнаць іх на вуліцы практычна немагчыма. Пошук такіх — вельмі карпатлівая праца, ступень латэнтнасці вельмі высокая. Да таго ж дзеці рэдка расказваюць аб тым, што здарылася. Бацькі павінны ведаць, з кім дзіця сябруе ў сацсетках і месенджарах, пра што размаўляе. Трэба сачыць за змяненнем паводзін, цікавіцца яго жыццём па-за школай», — падкрэсліў Ігар Жыгалаў.

Найбольш уразлівымі аказваюцца дзеці, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, — з-за адсутнасці належнага бацькоўскага кантролю.

Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА лічыць, што ўстановам адукацыі і праваахоўным органам трэба ўзаемадзейнічаць больш цесна. «Да гэтай тэмы трэба падыходзіць уважліва. Размова ідзе аб душэўным стане дзіцяці, псіхалагічнай траўме. Найбольш схільныя да такіх замахаў адзінокія дзеці, дзеці з неўладкаваных сем'яў. З імі павінны працаваць вопытныя педагогі, якім дзіця зможа даверыцца», — лічыць губернатар.

На пасяджэнні прывялі два прыклады. Так, у адной з сельскіх школ ахвяра вычварэнца неаднаразова расказвала пра гэта настаўніку. Адначасова дзяўчынка падвяргалася булінгу з боку аднакласнікаў.

Супрацьлеглая сітуацыя здарылася ў іншай школе: педагогі даведаліся пра сувязь дзяўчынкі з 37-гадовым мужчынам і паведамілі пра гэта ў міліцыю. Інфармацыя пацвердзілася, заведзена крымінальная справа.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Прававая гасцёўня

ПАДОРАНАЕ Ў ШЛЮБЕ ПАПАЛАМ НЕ ДЗЕЛІЦЦА

«Я выхоўваю дзіця-інваліда. Мой муж падарыў мне аўтамабіль. Дагавор дарэння афармлялі ў ДАІ, і ў тэхпашпарце ўладальніцай указана жонка — я. Пры гэтым стаіць адзнака, што аўто належыць мне па дагаворы дарэння. Праз паўгода пасля гэтага мы развяліся. А яшчэ праз год былы сужэнец падаў у суд іск аб падзеле агульнай сумеснай маёмасці (гаворка менавіта пра машыну) і патрабуе з мяне палову кошту аўто. Ці мае права ён гэта рабіць?

Яўгенія С., г. Маларыта».

На пытанне адказвае **Алена СЦЯПАНАВА, адвакат Мінскай гарадской калегіі адвакатаў, старшыня Беларускай лігі сямейных медыятараў, трэнер медыятараў Цэнтра медыяцыі і перагавораў:**

— Згодна з артыкулам 26 Кодэкса аб шлюбе і сям'і маёмасць, якая належала сужэнцам да шлюбу, а таксама была атрымана ў дар або спадчыну, з'яўляецца ўласнасцю кожнага з іх. Аднак артыкулам 27 Кодэкса прадугледжана, што муж і жонка могуць уступаць паміж сабою ва ўсе незабароненыя заканадаўствам маёмасныя здзелкі адносна маёмасці, якая з'яўляецца ўласнасцю кожнага з іх.

З гэтых нормаў вынікае, што калі адзін з сужэнцаў падарыў другой палове нейкую маёмасць падчас шлюбу (у вашым выпадку — аўто), то яна не будзе з'яўляцца агульнай сумеснай маёмасцю сужэнцаў. Машына ў гэтым разе — асабістая ўласнасць адоранага, ваша.

Падаць у суд — права вашага мужа, аднак вы як адказчык па справе маеце працэсуальныя правы, у тым ліку і на абарону супраць прад'яўленага іску. Адпаведна з артыкулам 60 Грамадзянскага кодэкса адказчык мае права на абарону супраць прад'яўленага іску. Ён можа сфармуляваць сваю пазіцыю ў пярэчаннях супраць іску або прад'явіць сустрэчны іск.

Раю вам падрыхтаваць пісьмовыя пярэчанні супраць іску з прававым абгрунтаваннем пазіцыі і прыкладанням дакументаў-доказаў (дагавор дарэння, тэхпашпарт аўто з адзнакай, што ён належыць вам па дагаворы дарэння).

Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш электронны адрас joyyya@gmail.com. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста і іншых ведамстваў мы будзем шукаць на іх адказы.

Ірына СІДАРОК.

ХТО Ў САДОК НЕ ХАДОК?

Дзіцячая ўстанова не можа быць пакараннем

— Як цябе завуць? — запыталася выхавальніца ў Сымона, калі той упершыню прыйшоў у дзіцячы садок.
— Алень, — насупіўся малы.
— Ну тады я буду зайчыкам ці лісічкай. Добра? — знайшлася Вольга Пятроўна.
Ужо на чацвёрты дзень малы адзін паехаў у садок на школьным аўтобусе і ўпершыню застаўся там спаць. «Рана радуешся», — суцішыла маю эйфарыю сяброўка. І як у ваду глядзела. Праз тыдзень пра тое, што Сымон не хоча ісці ў садок, ведала ўся вёска. Так моцна ён плакаў, калі бачыў жоўты аўтобус... Аказваецца, з нежаданнем дзіцяці ісці ў садок сутыкаецца практычна кожная мама. Як сябе паводзіць у такой сітуацыі, як правільна рэагаваць на слёзы? Пра гэта размаўляем з дзіцячым псіхолагам Людмілай ГУБСКАЙ.

ХТО ГАЛОЎНЫ?

— Людміла, як мякка вярнуць жаданне малога наведваць садок?

— Набярыцеся цярпення. Адаптацыя да садка доўжыцца 6—8 тыдняў. Адзін з яе этапаў — пратэст. Тут важна не саступаць дзіцяці і працягваць вадзіць яго ў садок. Пры гэтым тлумачыць, што іншых варыянтаў няма, бо вас чакаюць на працы.

Дзіцячы настрой пераменлівы як надвор'е. Раніцай малы можа крычаць, бо не хоча ў сад. А ўвечары — бо не хоча з сада. Здараецца і такая сітуацыя: мама прыйшла забіраць сына пасля сну, а ён загуляўся і сказаў: «Не пайду». — «Добра, пагуляй яшчэ», — пагадзілася яна. Выхавальніца радасна паківала галавой, маўляў, прыходзьце пазней. У выніку ўвечары мама застала сына ў слязах. Калі дзіця прымае рашэнне застацца, яно прыме рашэнне і ніколі не хадзіць у садок. Таму важна разумець, што мама і тата — галоўныя, таму вырашаць павінны яны. Калі рашэнне хадзіць ці не хадзіць у садок прымае дзіця — мы бачым перакуленую іерархію. І гэта вельмі небяспечна.

«Ніколі не кажыце: «Не будзеш слухацца, адвяду ў садок». Нават у жарт. Каб дзіця не ўспрыняло садок як пакаранне».

— Бліжэй да 2 гадоў бабулі пачынаюць ціснуць на бацькоў: маўляў, калі мы ўжо пойдзем у садок? Яны ж у свой час вымушаны былі аддаваць туды дзяцей у 1,5 года, а то і раней. Разам з тым ёсць меркаванне, што да 5 гадоў дзіцяці наогул не патрэбны садок. У якім узросце раіце пачынаць вадзіць туды малечу?

— Часцей за ўсё ў 3—3,5 года дзеці ўжо не проста гатовыя, а ўжо хочуць хадзіць у садок. Менавіта ў гэтым узросце з'яўляецца патрэба вучыцца ўзаемадзейнічаць з іншымі дзеткамі: у тым ліку сварыцца, адстойваць свае межы, выказваць прэтэнзіі, крыўду. Дзеці, якія не наведваюць дзіцячы садок, усё гэта «перакладаюць» на плечы бацькоў. Пачынаюць абзывацца на маму, не чуюць яе і не слухаюцца — як вынік, яна страчвае аўтарытэт.

— Ці варта цвёрда трымацца пазіцыі: у садок трэба хадзіць штодзень?

— Усё залежыць ад магчымасцяў бацькоў. Дзецям гадоў да чатырох складана вытрымаць цэлы дзень на працягу 5 дзён. Яны стамляюцца. Гэта прыводзіць да нервовых зрываў, прастуд. Цудоўна, напрыклад, сераду аб'явіць бабуліным днём. Альбо ў нейкі з дзён забіраць малечу з сада раней, чым звычайна. Але ні ў якім разе нельга рабіць выхадны з-за пратэсту дзіцяці. Вы павінны ўсё распланаваць і напярэдадні вечарам папярэдзіць малога. Запланаванае добра ўспрымаецца дзецьмі.

НЕ ПРЫМУШАЦЬ, А ЗАЦІКАЎЛІВАЦЬ

— Што рабіць, калі дзіця плача наўзрыд, прыходзячы ў дзіцячы садок?

— Выказваць нязгоду праз слёзы — нармальна. Важна гэта не замацаваць, не ператварыць

у рытуал. Каб слёз было менш, трэба зборы, дарогу ў садок і развітанне напаўнець чымсьці цікавым. У маёй практыцы быў выпадак, калі хлопчык ніяк не хацеў адпускаць маму: «Мамачка, не сыходзь. Нічога купляць не трэба. Ты працуй, а я буду проста ціхенька гуляць побач». І мы пачалі даваць яму даручэнні. Сёння прасілі перадаць выхавальніцы каляровую паперу і кардон, заўтра — пэндзлікі і фарбы, паслязаўтра — расфарбоўку. Малы з важным відам і са словамі «мне даручылі» заходзіў у групу. І яму ўжо было не так страшна. Можна ўвечары намаляваць разам малюнак, каб у садку падарыць выхавальніцы. Шукайце штосьці цікавае, што можна паказаць па дарозе ў садок, — тады думкі дзіцяці будуць занятыя іншым і яно не будзе плакаць.

Па дарозе з садка дадому таксама размаўляйце з малым. «Сумна сёння ранак прайшоў, давай заўтра зробім па-іншаму». Раю нават сцэнарый намаляваць ва ўяўленні малечы. Можна пагуляць дома «ў садок» з цацкамі. Агарадзіце тэрыторыю кубікамі, каб мамы-жывёлы вялі туды сваіх дзетак. Можна задзейнічаць лялькі ці машынкі, гледзячы што малому даспадобы. Прайграйвайце і прагаворвайце цяжкую для яго сітуацыю расстання з мамай. Можна паспрабаваць казкатэрапію: прыдумляйце цікавыя гісторыі з вашым малым у галоўнай ролі. Уплятайце у іх імёны дзетак, выхавальніцы, каб праз казку яны сталі добрымі сябрамі. Ёсць шмат кніг пра садок. Напрыклад, «Мышаня Цім ідзе ў дзіцячы садок», «Зайчык Сева не хоча ісці ў дзіцячы садок», «Лама ў садзіку без мамы». Яны змяншаюць трывожнасць не толькі дзіцяці, але і мамы. Магу параіць мультфільм пра пінгвіняня Ла-ло — там прататып дзіцячага садка.

— Знаёмая некалькі дзён запар па гадзіне праводзіць у садку, угаворваючы дзіця там застацца. Прычым плача і малы, і яна...

— Як правіла, дзеці плачуць, пакуль мама не сыходзіць. А потым бягуць гуляць, як быццам нічога і не было. У такім выпадку задача мамы — працаваць над рытуалам развітання. Альбо даручыць вадзіць у садок дзіця дарасламу, з якім малечы прасцей развітвацца, напрыклад тату, бабулі.

Важна звяртаць увагу не столькі на тое, як дзіця развітваецца, колькі на тое, у якім настроі вяртаецца з дзіцячага садка. Працяглы плач з любой нагоды, больш доўгае ўкладванне спаць, парушэнне сну (нечаканы плач ці мокры ложак), пратэсты, якіх дагэтуль не было, — вось нагода для хвалявання бацькоў.

— Што датычыцца прыемных рытуалаў... Мая сяброўка зрабіла з палімернай гліны пярсцёнак. Даве яго дачушцы, калі вядзе ў садок, каб тая заўсёды памятала, што мама побач.

— Так, рытуалаў развітання вельмі шмат. Усё залежыць ад вашай фантазіі. Можна бранзалецік на ручку завязаць, падарыць сардэчка ці пацалаваць у запясце. Маўляў, калі табе стане сумна, успомніш, як я цябе пацалавала, — і табе адразу стане лепш. Вельмі многае залежыць ад настрою бацькоў, ад таго, з якім выразам твару, з якімі думкамі аддаюць малечу ў садок. Дзіця добра счытвае эмацыянальны стан дарослых.

ДОМА ПАВІННА БЫЦЬ СУМНАВАТА

— Якія першыя крокі трэба зрабіць бацькам, каб мінімізаваць стрэс дзіцяці?

— Калі мама — адзіны дарослы чалавек, з якім дзіця вырашала свае пытанні, то яно будзе вельмі траўматычна перажываць адаптацыю да садка. Таму раю пакідаць яго з іншымі дарослымі, якія прыходзяць у госці і гуляюць, кормяць, укладваюць спаць. Потым тое ж самае рабіць дома ў бабулі. Да дзіцячага садка пажадана, каб дзіця ўмела засынаць і прачынацца на чужой тэрыторыі. Тады садок не стане татальным стрэсам.

У маёй практыцы была сітуацыя, калі хлопчык ледзь не з першага дня папрасіўся пакінуць яго спаць у садку, як і сястру. Бацькі так і зрабілі. Забіралі абаіх дзетак увечары. Але хлопчык перастаў нармальна спаць начамі. Прачынаўся ў тры гадзіны ночы з крыкам «есці!». Адну ноч бананам пакармілі, на другую — кашу зварылі, на трэцюю — бліны спяклі. Да гэтага дзіця спала нармальна. Пачалі шукаць прычыну. Аказалася, трывожнасць узнікла пасля таго, як хлопчыка пачалі пакідаць на сон у садку. Я параіла бацькам скараціць яму час наведвання садка. І падаўжаць паступова, каб малы паспеў прыстасавацца. Рэкамендую дзяцей, якія не заставаліся без мамы надоўга, раней чым праз тры тыдні не пакідаць у садку на сон.

— Што яшчэ нельга рабіць адназначна?

— Ніколі не кажыце: «Не будзеш слухацца, адвяду ў садок». Нават у жарт. Паход у садок не павінен супадаць з іншымі знакавымі падзеямі ў жыцці сям'і. Напрыклад, з завяршэннем грудного ўскармлівання, нараджэннем браціка ці сястрычкі. Каб дзіця не ўспрыняло садок як пакаранне.

Я заўсёды прашу сваіх кліентаў не расказваць дзецям, што ў садку весела. Туды ходзяць не таму, што там весела. А таму, што бацькам трэба займацца сваімі справамі. Навізна садка знікае праз 3-4 наведванні. У некаторых дзяцей — праз 2.

Абмяркоўвайце садок і выхавальнікаў выключна ў станоўчых фарбах. Дзяліцеся пазітыўнымі ўспамінамі з уласнага дзяцінства. Пакажыце свае фотаздымкі. Калі малеча зразумее, што тата і мама таксама хадзілі ў садок, то прасцей будзе да гэтага ставіцца.

— Але ж не ўсё залежыць ад бацькоў. Часам дзіця не хоча хадзіць у садок, бо там пастаянна прэсінгуюць, прымушаюць падпарадкоўвацца. Мая сястра дагэтуль з жахам згадвае, як цёця Валя прымушала яе піць малако, якое дзяўчынка цярпець не магла. Малая закрывала нос і піла. Інакш не пайшла б на прагулку. Як быць у такой сітуацыі?

— На жаль, здараюцца выпадкі, калі і выхавальніца, і нянечка пужаюць дзяцей уколамі і страшылкамі: «Калі не даясі катлетку, цябе мама з садка не забярэ», «зачыню ў каморы», «суп за каўнер вылью»... Дзеці ўсе рознія. Аднаму гэта як з гусі вада, а іншы, больш уразлівы, можа і спужацца. Калі вы ўбачылі трывожны званочак у выказваннях ці паводзінах дзіцяці, трэба паразмаўляць з выхавальніцай ці нават загадчыкам садка. Толькі не раю сварыцца і скардзіцца. Лепш ісці з просьбай — дапамажыце разабрацца з сітуацыяй. Калі ж немагчыма нічога змяніць, то трэба перавесці малечу ў іншы садок ці групу.

«Можна пагуляць дома «ў садок» з цацкамі. Агарадзіце тэрыторыю кубікамі, каб мамы-жывёлы вялі туды сваіх дзетак. Можна задзейнічаць лялькі ці машынкі, гледзячы што малому даспадобы».

Вядома, маму не заменяць ніякія, нават самыя лепшыя дзіцячыя ўстановы. Але бацькі могуць зрабіць, каб дзіцяці захацелася ў садок. Раю, перад тым як весці туды малога, на нейкі час «забыць» пра яго сумесныя гульні з дарослымі. Дома павінна быць крыху... сумнавата. Тады і садок з цягам часу будзе ў радасць.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

Крыніца іх натхнення

Фота Вольгі ПАКЛОНСКАЙ.

УЛАСНЫМ ПРЫКЛАДАМ І ПРЫГАЖОСЦЮ

Пазнаёміліся Алесь і Юлія падчас вучобы ў Акадэміі мастацтваў. Да заканчэння вышэйшай установы ўжо ажаніліся. Яшчэ на самым старце сумеснага жыцця маладыя дамовіліся: у іх будзе як мінімум двое дзетак.

— Я ў бацькоў адзін і, колькі сябе памятаю, сумаваў без братоў і сясцёр. Таму не жадаў бы таго ж сваім дзецям, — прызнаецца Алесь. — Мне здаецца, сама атмасфера шматдзетных сем'яў пры ўмове, зразумела, здаровых зносін фарміруе менш эгаістычнага чалавека, які ўлічвае не толькі асабістыя жаданні і інтарэсы, але і іншых.

— Ведаю шмат прыкладаў, калі мастакі настолькі былі паглыблены ў творчасць, што не заўважалі, як растуць, чым цікавяцца і чым займаюцца іх дзеці, і ў выніку здараліся вялікія трагедыі, — працягвае Юлія. — Зразумела, што мы робім усё, каб пазбегнуць гэтага. Дзеці, іх выхаванне — наш прыярытэт у жыцці.

У сям'і Шацілаў шмат увагі ўдзяляюць адукацыі дзяцей. Свае працоўныя графікі муж і жонка заўсёды выстройвалі з улікам бацькоўскіх абавязкаў. Дзецьмі і бытам у большай ступені займалася Юлія, але і Алесь знаходзіць час дапамагчы па гаспадарцы, удзяліць увагу сынам і дачцэ.

Старэйшы, Міхась, скончыў гімназію-каледж мастацтваў імя І. В. Ахрэмчыка, займаўся танцамі, умее іграць на фартэпіяна, баяне, гітары. Ён яшчэ шукае сябе і не вырашыў, у якім кірунку развівацца далей. Але ўпэўнены, што ў любым выпадку ў яго жыцці знойдзецца месца для мастацтва. Зося таксама іграе на фартэпіяна, малюе, любіць матэматыку, фізіку, цікавіцца робататэхнікай. Адаму падабаецца маляваць і слухаць казкі. З дапамогай мамы, бабуль і дзядуляў ён рыхтуецца зараз да школы.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Дачка пісьменніка Юлія ў дзяцінстве на сабе адчула ўплыў цікавых асоб і суразмоўцаў — адбітак ад сустрэч з імі назаўжды застаўся з ёю. Зараз самой бывае дзіўна, калі ўспомніць, што некалі яе гладзіла па галаве пісьменніца, паэтка і мастачка Зоська Верас, якая ведала Максіма Багдановіча. Беларускі графік Алена Лось у свой час намаляваła партрэт старэйшай дачкі Уладзіміра Ягоўдзіка ў юнацтве, а зараз Юлія працуе ў яе майстэрні. Такія выбітныя асобы вельмі ўзбагацілі яе ўнутраны свет. Таму і жыццё сваіх нашчадкаў мастачка імкнецца насычаць радасцю чалавечых зносін, асалодай чытання, прыгажосцю прыроды.

— Чалавек — істота культурная, і яго фарміраванне можа адбывацца ці на падставе сапраўднай культуры, ці на прыкладах маскультуры, — заўважае Алесь. — Калі не стаіш на пазіцыі чагосьці грунтоўнага, становішся пракаці-полем. На жаль, масавая культура, лічбавы электронны свет зараз вельмі моцна ўплываюць на дзяцей. Таму мы стараемся стварыць альтэрнатыву: знаёмім іх з дасягненнямі сусветнай і нацыянальнай культуры.

Летам бацькі разам з дзецьмі часта адпраўляюцца на пленэры. Юлія разам з Міхасём і Зосяй неаднойчы бралі ўдзел у міжнародных конкурсах дзіцячага малюнка. Гэта дазваляла пабачыць свет, пазнаёміць сына і дачку з сусветным жывапісам, архітэктурай. Вельмі любіць сям'я Шацілаў вандраваць па Беларусі.

«Асенні нацюрморт» Юлії ЯГОЎДЗІК.

— У нашай сям'і ўсе размаўляюць на роднай мове, — падкрэслівае Юлія. — Зразумела, у школе, з сябрамі дзеці камунікуюць і па-руску. Але для нас важна, каб яны ведалі сваю мову і цікавіліся спадчынай. Гэта наш свядомы культурны выбар. Другая, вельмі прынцыповая пазіцыя — выхаванне на падставе сапраўднай літаратуры, музыкі, жывапісу. Мне здаецца, неабходна знаёміць, вучыць разумець мастацтва. У доме павінны быць добрыя кніжкі, прыгожыя ілюстрацыі. Асабіста я без гэтага не ўяўляю жыцця.

— І маё, і Алесева дзяцінства прайшло ў вёсках. Мы ведаем увесь цыкл сялянскай працы і хочам, каб нашы нашчадкі таксама бачылі, як жывуць вясковыя людзі, — дзеліцца Юлія.

І мама, і тата стараюцца заставацца шчырымі з дзецьмі і выхоўваць не маралізатарствам, а ўласным прыкладам, калі словы не разыходзяцца са справай. Здаецца, гэта ў іх паспяхова атрымліваецца.

Па словах Зосі і Адама, больш строгая з бацькоў мама: яна патрабуе дысцыпліны і парадку, прывучае дапамагаць па доме, не дазваляе шмат сядзець у гаджэтах. Але, нягледзячы на пэўныя забароны і абмежаванні, дзеці не адчуваюць, што іх «заціскаюць».

— Зразумела, што ў шматдзетнай сям'і даводзіцца часам ад нечага адмаўляцца, чымсьці ахвяраваць, — разважае Міхась. — Але гэта і вучыць жыць сярод людзей. І, на мой погляд, мець бацькоў, сястру і брата — здорава, цікава і весела. Заўсёды ёсць з кім пагаварыць, параіцца, нешта абмеркаваць. Зося і Адам ніколі не даюць засумаваць!

ТВОРЧАСЦІ ШМАТ НЕ БЫВАЕ

Алеся і Юлію Шацілаў аб'ядноўваюць дзеці і мастацтва. Яны некалькі разоў ладзілі сумесныя выстаўкі, у тым ліку ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі. Муж і жонка не згодны з тым, што два творчыя чалавекі на адну сям'ю — гэта шмат. Уся іх сям'я вельмі крэатыўная, і яны лічаць гэта сваім плюсом. Агульнасць светапоглядаў не перашкаджае кожнаму ісці сваім творчым шляхам, шукаць галоўную тэму і сродкі выяўлення.

— Мая асноўная тэма ў мастацтве — чалавек. Мне цікавыя людзі, якім падабаецца жыць і рабіць нешта добрае на зямлі, — адзначае Алесь.

«Лірнік», «Дудар», «Шляхціч», «Гарманіст», «Музыкант» — у скульптурах Алеся Шацілы ўвасоблены асобы, якія маюць свае нацыянальныя карані, але ж гэта і вобразы людзей на ўсе часы.

Для Юліі знакавая тэма — драматычны лёс вёскі, якая паступова сыходзіць. Гэтаму прысвечаны яе карціны «Адыходзіць час», «Смутак», «Пад небам», «Развітанне», «Рэквіем». Разам з самотнай нотай у творчасці мастачкі ёсць і іншая — вельмі яшчэсцвярджальная і светлая. «Лілеі», «Цюльпаны», «Нацюрморт з вінаградам», «Прыйшла вясна», «Ліпеньская ноч» — сапраўднае любаванне навакольным светам, цудам прыроды, якое даступна кожнаму для натхнення і адчування сілы прыгажосці.

Ні Алесь, ні Юлія не пакутуюць ад адчування таго, што цяпер складана быць мастакамі. Яны стараюцца як могуць забяспечваць сям'ю і пакідаць пэўны час для творчасці. Хаця, зразумела, гэта няпроста. Юля не хавае, што бываюць перыяды, калі на ўласную творчасць у яе амаль не застаецца часу. Але ж пасля перапынкаў апетыт да працы толькі ўзрастае. Зразумела: сям'я — таксама вялікая праца. Але ж гэта і крыніца натхнення.

— Я і студэнтам часам кажу ў якасці прыкладу: вось у нас з жонкай трое дзяцей, — прызнаецца Алесь. — Зразумела, бывае цяжка. Але мы перажываем такое шчасце, якога не зведалі б, калі б мы не знайшлі адно аднаго і ў нас не было б Міхася, Зосі і Адама.

Вольга ПАКЛОНСКАЯ.

Нататкі навaспечаных вяскоўцаў

ЖЫРАНДОЛЯ З КАЛАЎРОТА

З кожным годам усё больш знаёмых перабіраюцца жыць у вёску. А зацятыя вандроўнікі Аўгіня і Верасень мала таго, што вярнуліся на радзіму і пасяліліся на хутары на Валожыншчыне, дык яшчэ і выкупілі пасля смерці суседкі яе хату. Там стварылі арт-хутар — месца для натхнення і адпачынку творчых людзей. Назвалі яго «Васіліна». У памяць аб былой гаспадыні дома.

Кранальна назіраць, з якім клопатам маладыя людзі імкнуцца захаваць аўтэнтычнасць і мясцовыя традыцыі ў афармленні арт-хутара. Прадумваюць усё да дробязяў. Так, Аўгіня хоча паспрабаваць аднавіць карункавыя фіранкі, што пабачыла ў суседняй вёсцы. А сцены хаты аздобіць фотаздымкамі і дакументамі, якія сваякі бабы Васіліны пакінулі, бо не палічылі каштоўнымі...

Мы з мужам таксама марылі выкупіць суседні зруб, які шмат гадоў быў у запусценні. Думалі пакрысе прывесці ўчастак і хату ў парадак. Каб у будучыні ладзіць майстар-класы па выпечцы хлеба на заквасцы ў сапраўднай печы. Два гады выношвалі гэтую ідэю. І — наўмысна не прыдумаеш — менавіта ў той дзень, калі патэлефанавалі ў сельсавет, каб удакладніць кошт участка... пазнаёміліся з яго новымі гаспадарамі. «Ну, значыць, гэта нам пакуль не па сілах», — па-філасофску супакоілі самі сябе. І ад душы парадаваліся за новых суседзяў. Асабліва за зруб бабы Зіны. Таму што больш за ўсё мы баяліся, што новыя гаспадары знясуць старую хату ці абкладуць яе сайдынгам. Яны ж вырашылі захаваць усё як ёсць і нават адрэстаўрыравалі сваімі сіламі бабуліну мэблю.

...Ёсць людзі, якія без шкадавання развітваюцца са старымі рэчамі. Бо лічаць іх хламам. А ёсць такія, як мы і нашы новыя суседзі, хто гэты «хлам» (дакладней, скарб) збіраюць.

Так у нас дома сёлета з'явіўся дыяпраектар. Ужо, напэўна, паўгода не паказваю сыну мультыкі. Не падабаецца мне рэакцыя пасля іх прагляду. Як правіла, пачыналася істэрыка, што выключыла. Альтэрнатыва — старыя добрыя дыяфільмы. Пасля такіх мультыкіаў чамусьці істэрыкі няма.

Год таму, калі наш сусед Сава прадаваў бацькоўскую хату, павыкідаў чыгункі ды чапялу. Муж, вядома ж, прынёс той скарб дадому. І ўжо праз тыдзень выступаў з незвычайнымі музычнымі інструментамі на адкрыцці выстаўкі выцінанкі Вольгі Бабурынай, чым прыўнёс у імпрэзу непаўторны каларыт.

З калаўрота, знойдзенага на сметніку, атрымалася атмасферная жырандоля. Выцяжка на кухні ў нас таксама нетыповая — з пральнай машыны, якую прабабуля мужа набыла яшчэ па маладосці. Абедзенны стол, нягледзячы на ўгаворы бацькоў, зноў жа вырашылі не набываць. Пафарбавалі ў белы колер бабулін, рарытэтны, выраблены на Бабруйскай мэблевай фабрыцы імя Халтурына. І цяпер ён мне штодзень нагадвае аб летніх вакацыях, якія мы з сястрой у дзяцінстве бавілі ў Параднях у бабулі Зоні.

Вось на днях набылі двухспальны матрац. Узгалоўе ложка хочам зрабіць з дзверцаў старой драўлянай шафы. Ідэю гэтую падгледзелі ў фермера з суседняй вёскі. Засталося толькі знайсці чалавека, які палічыць старую шафу «хламам»...

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

Отчет за январь–сентябрь 2021 года

ООО «Санта Ритейл»

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 30 сентября 2021 года

тыс. руб.

АКТИВЫ	Код строки	На 30.09.2021	На 31.12.2020
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	343 648	313 879
Нематериальные активы	120	3 266	3 465
Вложения в долгосрочные активы	140	12 694	20 518
Долгосрочные финансовые вложения	150	630	928
Отложенные налоговые активы	160	7	2
Прочие долгосрочные активы	180	482	388
ИТОГО по разделу I	**190**	**360 727**	**339 180**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	67 589	71 085
в том числе: материалы	211	8 158	6 180
готовая продукция и товары	214	59 431	64 905
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	0	0
Расходы будущих периодов	230	9 053	8 914
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	715	5 533
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	49 395	48 218
Краткосрочные финансовые вложения	260	0	0
Денежные средства и их эквиваленты	270	8 611	16 785
Прочие краткосрочные активы	280	226	6
ИТОГО по разделу II	**290**	**135 589**	**150 541**
БАЛАНС	**300**	**496 316**	**489 721**
СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	**Код строки**	**На 30.09.2021**	**На 31.12.2020**
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	164 655	159 655
Резервный капитал	440	15	15
Добавочный капитал	450	29 845	30 294
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	-49 404	-49 782
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470	1 077	
ИТОГО по разделу III	**490**	**146 188**	**140 182**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	232 802	215 073
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	26	
Отложенные налоговые обязательства	530	1 783	1 784
Доходы будущих периодов	540		
ИТОГО по разделу IV	**590**	**234 611**	**216 857**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	2	11 118
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	36	63
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	115 479	121 501
в том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	103 546	107 736
по авансам полученным	632	649	876
по налогам и сборам	633	2 002	1 078
по социальному страхованию и обеспечению	634	1 319	1 740
по оплате труда	635	5 026	4 368
по лизинговым платежам	636	2 685	5 399
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637		
прочим кредиторам	638	252	304
Доходы будущих периодов	650		
ИТОГО по разделу V	**690**	**115 517**	**132 682**
БАЛАНС	**700**	**496 316**	**489 721**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–сентябрь 2021 года

тыс. руб.

Наименование показателей	Код строки	За январь–сентябрь 2021	За январь–сентябрь 2020
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	809 957	422 390
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(620 039)	(328 611)
Валовая прибыль (010-020)	030	189 918	93 779
Управленческие расходы	040	(22 779)	(8 713)
Расходы на реализацию	050	(175 081)	(94 655)
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050)	060	(7 942)	(9 589)
Прочие доходы по текущей деятельности	070	28 796	18 270
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(9 043)	(5 192)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060+070-080)	090	11 811	3 489
Доходы по инвестиционной деятельности	100	2 109	3 923
в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	1 911	2 492
проценты к получению	103	198	1 431
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	-	-
Расходы по инвестиционной деятельности	110	(2 639)	(2 118)
в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	(2 639)	(2 118)
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112		
Доходы по финансовой деятельности	120	935	13 634
в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	935	13 634
Расходы по финансовой деятельности	130	(11 143)	(18 512)
в том числе: проценты к уплате	131	(10 214)	(9 391)
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	(402)	(8 832)
прочие расходы по финансовой деятельности	133	(527)	(289)
Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100-110+120-130)	140	(10 738)	(3 073)
Прибыль (убыток) до налогообложения (±090±140)	150	1 073	416
Налог на прибыль	160		
Изменение отложенных налоговых активов	170	5	
Изменение отложенных налоговых обязательств	180	1	(89)
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	190		
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	(2)	(1)
Чистая прибыль (убыток) (±150-160±170±180-190-200)	210	1 077	326
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220		
Совокупная прибыль (убыток) (±210±220±230)	240	1 077	326

УНП 291313486

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

ОАО «СЛОНИМСКАЯ КАМВОЛЬНО-ПРЯДИЛЬНАЯ ФАБРИКА»

	Лот № 1		Лот № 2	
Предмет торгов, краткая характеристика	**Капитальное строение, инв. № 450/С-29536** (прирельсовый склад), общей площадью 162,0 кв. м, кирпичное, 1982 г. п.		**Капитальное строение, инв. № 450/С-20683** (здание центральных ремонтных мастерских) общей площадью 1900,5 кв. м, кирпичное, 4 этажа, 1975 г. п., ранее использовалось как административно-бытовой корпус	
Информация о земельном участке	Кадастровый номер 425450100001009162, площадь – 0,0303 га, ограничения (обременения) – водоохранная зона, право аренды по 10.06.2049 г.		Кадастровый номер 425450100001007942, площадь – 0,0693 га, право аренды по 30.01.2033 г., здание расположено на территории СЭЗ «ГродноИнвест»	
Место-нахождение	г. Слоним, ул. Вокзальная, 9		Гродненская обл., г. Слоним, ул. Брестская, 50А	
Начальная цена с учетом НДС	**43 560,00 рублей**	Задаток (1 %) – 436,00 руб.	**630 114,41 рублей**	Задаток (1 %) – 6 301,00 руб.

Торги состоятся 26 ноября 2021 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8

Срок подачи документов: **по 22 ноября 2021 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно ул. Мицкевича, 8**

Сведения о продавце: ОАО «Слонимская камвольно-прядильная фабрика», г. Слоним, ул. Брестская, 50, тел. 8 (0152) 25037.
Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка: Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 621632, счет BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., код BLBBBY2X, УНП 500481906. Срок заключения договора купли-продажи: в течение 10 дней с момента проведения аукциона. Оплата: в течение 30 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи. Условия участия и порядок проведения аукциона на сайте www.fincentr.by, тел. 8 (0152) 621632. Предыдущая публикация: газета «Звязда» от 09.06.2021 г.

ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества ОАО «РСП-12» (УНП 500011281), объявляет о проведении **06.12.2021 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by

Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2021/11/spisok-imushhestva-rsp12-na-torgi-06.12.21.pdf

Местонахождение имущества: Гродненская область, Кореличский район, г. п. Кореличи, ул. Гастелло, д. 54.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.

Продавец: ОАО «РСП-12», тел. +375293667568.

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 226, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере **5 %** от начальной стоимости лота не позднее **03.12.2021 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933 в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с **9.00 04.11.2021 г.** по **17.00 03.12.2021 г.** на bankrottorg.by. Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:
- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов в электронной форме, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение публичных торгов в электронной форме составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре; аукционный сбор: по лотам – 5 % от цены реализации предмета торгов.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение десяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок и порядок оплаты (условия оплаты): в течение тридцати календарных дней со дня проведения аукциона.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Планар» (продавец)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ

ЗДАНИЯ ЦЕХА ДЕРЕВООБРАБОТКИ

(составные части и принадлежности: пристройка),
общей площадью 1 307,1 кв. м с инв. № 601/С-27937, расположенного на земельном участке площадью 0,3209 га с кадастровым номером 623288005101000004
(право постоянного пользования)
по адресу: Минская область, Логойский район, Янушковичский с/с, д. Жабичи, ул. Метростроевская, 20Г.

Начальная цена с НДС (20 %) – **264 506,47** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **26 450,00** бел. руб.
Начальная цена снижена на 40 %.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 31.07.2021, 14.10.2021.

Аукцион состоится **18.11.2021** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.11.2021** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320**.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11. Тел. для осмотра (8044) 797-93-83.

УНП 100104937

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1: право заключения договора аренды сроком 3 года капитального строения, инв. № 110/С-72339 (назначение – здание специализированное железнодорожного транспорта) площадью 332,9 кв. м с покрытием площадью 351 кв. м, расположенного по адресу: г. Барановичи, ул. Фроленкова, 7А.

Условия проведения аукциона: целевое назначение арендуемых площадей – оказание услуг, организация розничной торговли, размещение офиса (сотрудников), организация общественного питания.
Размер ежемесячной арендной платы: 171,45 базовой арендной величины. Начальная цена продажи объекта – 2 897,51 руб. (две тысячи восемьсот девяносто семь рублей пятьдесят одна копейка) с учетом НДС.
Сумма задатка – 289 руб. (двести восемьдесят девять рублей)

Продавец – УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» Барановичский вагонный участок, 230023, г. Гродно, ул. Буденного, 37, УНП 200272821, тел./факс (0163) 60-60-62, тел. 73 43 42

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 55-87-70, 55-87-70

Условия расчетов и заключения договора аренды:
- срок подписания договора аренды – 10 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона с представлением копии платежных документов перечисления суммы за право заключения договора аренды;
- срок оплаты – 3 рабочих дня с даты подписания протокола о результатах аукциона (но до заключения договора аренды)

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 03 декабря 2021 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)

Последний день приема заявлений – 01 декабря 2021 г. до 15.00

Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», https://grino.by/aukcion/

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

информирует о проведении 23.11.2021 г. открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Компания «МогНат»

Лот № 1: капитальное строение с инв. № 700/С-68770 – котельная, пл. – 687,6 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-68772 – мазутонасосная**, пл. – 41,0 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-91634 – склад**, пл. – 44,2 кв. м. **Емкость металлическая 80 м³**, инв. № 5283; **участок наружной канализации протяженностью 137,1 м** (инвентарный № 700/С-90642). Лот № 1 расположен по адресу: г. Могилев, ул. Островского, 64В, на земельном участке с кадастровым номером 740100000005005430 (пл. – 0,4562 га). Отдельный земельный участок под обслуживание лота не выделен.

Начальная цена продажи: 111 072,00 бел. рублей с учетом НДС. Сумма задатка: 11 107,20 бел. руб.

Аукцион состоится 23 ноября 2021 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона ino.by.

Организатор аукциона: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 351, 352, **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25, Mogilev@ino.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Слуцкая фабрика пошива одежды» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже

КОМПЛЕКСНОГО ПРИЕМНОГО ПУНКТА

(составные части и принадлежности: комплексный приемный пункт (А1/к), пристройка (Б1/к), пристройка (1), сарай (2), уборная (3), дорожка (а), забор (б)), **инв. № 640/С-60756 общей площадью 125,2 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624682704601000360 *(право постоянного пользования)* площадью 0,0474 га по адресу: Минская область, Слуцкий район, г. Слуцк, ул. Дружная, 1.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 63 116,78** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены **– 6 311,00** бел. руб.).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082 600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **09.12.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.12.2021** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.
Тел. для осмотра: 8 (017) 956 36 00, 8 (029) 370 56 01.

УНП 600154407

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец имущества) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснёва Н.М. извещает о проведении 23 ноября 2021 года открытого аукциона со снижением начальной цены на 90 % по продаже ДЕБИТОРСКОЙ ЗАДОЛЖЕННОСТИ в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

ПОЛНЫЙ И ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ДЕБИТОРСКОЙ ЗАДОЛЖЕННОСТИ (ЛОТЫ №№ 1–35) на сайте www.bankrot.gov.by.
Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».
Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62.

Продавец: ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука, 12.
Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.**
Для участия в аукционе необходимо:
1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельоблстрой»)**: р/с BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001, в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления);
2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 4 ноября 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.
Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 19 ноября 2021 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).**
Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за **5 (пять) дней** до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене**, увеличенной на 5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов, возместить затраты, связанные с организацией и проведением торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст. 127–129.
Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 19.01.2021 г. № 9 (29378).
Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by раздел «Аукционы» или на сайтах www.gomeloblreklama.by, www.bankrot.gov.by.

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов:
8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62.

Извещение о проведении 6 декабря 2021 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ»

Наименование, характеристики и местонахождение предмета торгов (продаваемого имущества)	Капитальное строение* с инв. номером 254/С-11593 общей площадью 1 268,5 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, Узменский с/с, д. Леонполь, ул. Парковая, 1, наименование – усадебный дом, назначение – памятник исторический, идентифицированный в основном как нежилой дом, составные части и принадлежности: кирпичный подвал, четыре кирпичных столба, дощатое ограждение, деревянные ворота, три калитки; капитальное строение** с инв. номером 254/С-11594 общей площадью 241,9 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, Узменский с/с, д. Леонполь, ул. Парковая, 1/1; наименование – спальный корпус, назначение – здание нежилое; капитальное строение** с инв. номером 254/С-11595 общей площадью 421,6 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, Узменский с/с, д. Леонполь, ул. Парковая, 1/2; наименование – столовая с пристройкой, назначение – здание нежилое, составные части и принадлежности – кирпичная пристройка
Сведения о земельном участке	Право аренды на земельный участок площадью 1,3564 га (срок действия: с 25.10.2012 по 23.08.2062), кадастровый номер – 223381306601000107, целевое назначение – земельный участок для обслуживания объектов историко-культурного назначения: объектов усадебно-паркового комплекса «Леонполь» (усадебного дома с остатками флигеля, воротами и оградой, спального корпуса, столовой с пристройкой), назначение в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества – земельный участок историко-культурного назначения
Продавец имущества	ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ», 220108, г. Минск, ул. Казинца, 121А
Организатор торгов	Государственное предприятие «МГЦН», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10
Начальная цена предмета торгов, с учетом НДС: 236 280,0 бел. руб.	**Сумма задатка:** 23 600,00 бел. руб.

Необходимые условия: победитель торгов (покупатель) после перехода права собственности на продаваемое имущество обязан в течение одного месяца подписать охранное обязательство и обеспечить сохранность историко-культурной ценности. *Ограничения (обременения) прав на недвижимое имущество, установленные в связи с присвоением ему статуса памятника историко-культурного наследия. **Капитальное строение входит в перечень материальных объектов, которым придан статус и категория историко-культурных ценностей Республики Беларусь, утвержденный постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 14.05.2007 № 578 «Аб статусе гісторыка-культурных каштоунасцей Рэспублікі Беларусь»

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ», утвержденным организатором торгов.

Условия торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 06.12.2021.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **6 декабря 2021 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 04.11.2021 по 02.12.2021** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (017) 242-63-61.

Телефоны для справок: (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 242-63-61 (ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ»).

Дополнительная информация размещена на сайте **www.mgcn.by** в разделе «Недвижимость в собственность».

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 9 декабря 2021 года проводит 23-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Номер лота	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
285	Автомобиль ГАЗ-6612 ш. ХТН006612М0657709 с кузовом-фургоном К-66Н № 68780 1991 г. *3 кат. пробег 3254 км*	г. Молодечно, в/ч 04152	5 000,00	1 000,00
286	Автомобиль ГАЗ-6615 ш. 0399049 с кузовом-фургоном К-66Н № 20985 1985 г. *3 кат. пробег 2076 км*	г. Молодечно, в/ч 04152	5 000,00	1 000,00
287	Автомобиль ГАЗ-6614 ш. ХТН006614М0649801 с кузовом-фургоном К-66Н № 74380 1991 г. *3 кат. пробег 593 км*	г. Молодечно, в/ч 04152	5 000,00	1 000,00
288	Автомобиль ЗИЛ-131 ш. 487597 с кузовом-фургоном К4. 131 № 04149 1982 г. *3 кат. пробег 1094 км*	г. Молодечно, в/ч 04152	11 060,00	2 212,00
289	Автомобиль ЗИЛ-131 ш. 337953 с кузовом-фургоном К2. 131 № 03514 1979 г. *3 кат. пробег 1519 км*	г. Молодечно, в/ч 04152	11 060,00	2 212,00
290	Автомобиль ЗИЛ-131 ш. 337958 с кузовом-фургоном К2. 131 № 0350 1979 г. *3 кат. пробег 1138 км*	г. Молодечно, в/ч 04152	11 060,00	2 212,00

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, 9 декабря 2021 г. в 10.00.

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до 15.00 6 декабря 2021 года.

Заключительная регистрация участников аукциона будет проводиться **9 декабря 2021 г. с 9.15 до 10.00.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней для резидентов Республики Беларусь и 10 банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»:
белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000, российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва, № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС.

Справки по тел./факсу (017) 319 35 41.

Извещение опубликовано на сайтах http://www.gki.gov.by/ru/ и https://bsk.by/.

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «МГЦН» извещает о проведении **23 ноября 2021 года в 11.00** аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды имущества в рамках **320-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды** капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности (далее – имущество)

№ предмета аукциона	Предмет аукциона (наименование, место нахождения недвижимого имущества, право заключения договора аренды которого выставляется на аукцион, срок договора аренды)	Площадь, кв. м	Начальная цена права заключения договора аренды имущества (руб.)
72	Часть пола на 1-м этаже здания вокзала «Барановичи-Полесские», расположенного по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Фроленкова, 13. Срок аренды – 3 года	4,63	21,13
73	Помещение, расположенное по адресу: Гродненская обл., Сморгонский р-н, Залесский с/с, аг. Залесье, ул. Советская, 18А. Срок аренды – 5 лет	13,0	54,93
74	Одноэтажное здание, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Ждановичский с/с, аг. Ждановичи, ст. Ждановичи. Срок аренды – 5 лет	30,2	127,60

Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10

Срок и место приема заявлений: со 2 ноября 2021 г. по 17 ноября 2021 г. включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах изложен в извещении о проведении аукциона, размещенном на интернет-сайтах: организатора аукциона – www.mgcn.by (раздел «Недвижимость в аренду»); Минского городского исполнительного комитета – www.minsk.gov.by (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»). **Телефон для справок** +375 (17) 360 42 22

НА ДАШЦЫ СКУРА ГАРЫЦЬ

Я даўно прыкмеціла, што Дашка строіць вочкі майму мужу Сашку, але відавочных доказаў здрады не было. Выказваць здагадку або сумненне на гэты конт не хацелася, — ён тут жа абвінаваціць: маўляў, дурніца, навыдумвала і сама верыць. Яшчэ і пасмяецца.

Дашка — гэта мая калега, пышная бландзінка з пятым памерам бюсту. Мы сябруем дамамі. Пасварыцца і страціць прыяцельку? А раптам я сапраўды недаверлівая і мне гэта толькі здаецца? Па сутнасці, калі ў іх ужо ўсё было, сварка нічога не зменіць. Сашка ў мяне яшчэ той хадок, лічыць, што сутнасць мужчыны — паляванне, толькі дурань не скарыстаецца выпадкам.

Жартуе: «Наша справа не нараджаць...» А на Дашцы, варта апынуцца побач падыходзячаму мужыку, літаральна скура гарыць — ну вось нарадзілася яна такая, хоць на характары нядрэнная.

Мы з Дашкай не так даўно атрымалі кватэры ў суседніх пад'ездах, дом пабудавала наша прадпрыемства. У нас тэлефон правялі, а ў Дашы

ў кватэры яшчэ не. Вось яна і ходзіць да нас ледзь ці не кожны дзень — патэлефанаваць то маці ў вёску, то сяброўцы (на мабільніку эканоміць).

У нядзелю прыйшла апоўдні. Я з раніцы зрабіла генеральную прыборку і ў момант яе прыходу дамывала посуд.

— Пазваню! — кінула яна з парога і да тэлефона ў пярэднім пакоі.

Дашкіна голая нага на прытэлефонным пуфіку апынулася прама перад адчыненымі дзвярыма ў вялікі пакой, якраз насупраць крэсла, дзе сядзеў Сашка і інвентарызаваў рыбалоўныя снасці. Я бачыла, якую спакуслівую паставу прыняла прыяцелька, але што тут скажаш? Зрабіць заўвагу — не стаў нагу на пуфік? Ну, ёй так зручна размаўляць. Ды і Сашку глядзець не забароніш — на тое і вочы.

— Дай анучу! — запатрабавала раптам Даша звычным голасам.

Сашка ўсміхнуўся куткамі вуснаў. Хітры, падлюка, чытае думкі жанчыны. Ліслівіць яму, што яго завабліваюць.

— Навошта табе ануча? — злуюся я.

— Тэлефон выцерці, — без усялякага сораму адказала Дашка.

— Я толькі што працерла, — вымавіла я строга.

— Ну і добра, — усміхнулася Дашка, — была парушынка, я яе ўжо садзьмула.

Яна падышла да свяцільні на сцяне, дэманстратыўна правяла пальцам па кранштэйне. Я ўжо літаральна кіпела ад злосці.

Але аблом... Самы прыдзірлівы не прычэпіцца. Дашка стаяла і глядзела на палец — паказаць ёй было няма чаго: я з раніцы ўсюды пыл працерла. Аднак жэст быў зроблены, і муж звярнуў на яго ўвагу. Мне хацелася заляпіць Дашцы анучай па руках, але стрымалася.

Убачыўшы выраз майго твару, яна хутка памяняла тэму:

— Паглядзі, які я касцюмчык прыкупіла!

Дэманстратыўна павярнулася. Касцюм сапраўды быў добры, белы ў чорныя лапачкі. Міні-спадніца абцягвала ногі і ўсё, што вышэй.

Сашка ціха ўсміхаўся і маўчаў. Я разумела: назірае, яму цікавая мая рэакцыя. Пагадзілася з Дашкай, што касцюм добры, а сама цямлю, куды б адправіць мужа, каб ёй не было перад кім круглявасцямі круціць.

— Зганяй па хлеб і малако, — папрасіла яго. Сашка адправіўся ў краму, а Дашка — дадому.

На працы я падзялілася сваёй занепакоенасцю з калегай Лідай, якой давярала.

— Я такога б не пацярпела, — прамовіла тая. — Выгнала б і яе, і яго.

Я запярэчыла, што, магчыма, гэта мае здагадкі, фактаў няма, са свечкай не стаяла. Паскардзілася, што мяне вельмі дастала Дашкіна паказная ахайнасць:

— Прыходзіць мяне экзаменаваць!

— Ахайнасць? — чмыхнула Лідка. — Мы на суботніку прыбіралі тэрыторыю якраз каля вашага дома і забеглі з дзяўчатамі да яе вады папіць. Дык мне было сорамна, што я іх туды прывяла! Пад сталом — куча пыльных бутэлек. На стале — брудны посуд. На падлозе — міскі з ежай для катоў — іх у яе два. Адпаведны пах... Кубкі — і тыя недамытыя. Нават піць з іх расхацелася.

Я яшчэ не была ў Дашы, але намаляваная Лідай карціна мяне заінтрыгавала. За ўласнай знешнасцю Дашка ж вельмі сачыла.

На наступны дзень я зайшла да яе, прыдумаўшы нейкую нагоду. Лідка не падманула — я ўбачыла менавіта тое, пра што яна мне маляўніча распавяла. Дашка пайшла на кухню прыгатаваць каву, а я агледзелася. Не верылася, што так жыве выпешчаная жанчына: станік на спінцы крэсла, куча брудных талерак на століку каля канапы — відаць, засталіся з вечара пасля прагляду серыяла, люстра ў выглядзе паўсферы пакрыта тоўстым пластом пылу...

Нядоўга думаючы, я напісала пальцам па пыле на люстры «Даша». Не ведаю, ці заўважыла яна гэты надпіс, толькі наяўнасць пылу ў маёй кватэры з таго часу правяраць перастала, як і ўвогуле да мяне хадзіць і Сашку завабліваць. Хоць на працы мы размаўляем, як і раней, і нават дадому разам ідзём...

Валянціна БЫСТРЫМОВІЧ.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

МЯСНЫ ПІРОГ НА БУЛЬБЯНЫМ ЦЕСЦЕ

Спатрэбіцца. Для цеста: *бульба — 200 г, мука — 200 г, яйка — 1 шт., масла — 50 г, соль — на смак.* ***Для начынкі:*** *свініна або свіны фарш — 500 г, балгарскі перац — 2 шт., памідор — 1 шт., невялікія цыбуліны — 2 шт., соль і перац — на смак, трохі надзёртага сыру.*

Бульбу абабраць і адварыць у падсоленай вадзе. Ваду зліць, бульбу расціснуць. Дадаць да бульбы яйка і масла, усыпаць муку і замясіць цеста. Калі яно занадта ліпне да рук, падсыпце яшчэ крыху мукі. Размеркаваць бульбяное цеста па змазанай маслам форме, фарміруючы высокія борцікі.

Мяса або фарш злёгку абсмажыць, дадаць цыбулю, памідоры і балгарскі перац, нарэзаныя кубікамі. Абсмажыць яшчэ некалькі хвілін.

Атрыманую начынку выкласці на цеста. Узбіць два яйкі з малаком, дадаць соль і перац на смак. Заліце пірог гэтай сумессю. Выпякаць у духоўцы 40 хвілін пры тэмпературы 200 °С. За 10 хвілін да гатоўнасці пасыпаць надзёртым сырам. Начынку ў гэтым пірагу можна вар'іраваць на свой смак: грыбы, курынае мяса, вэнджаныя каўбаскі, кукуруза...

МАННЫЯ ЗРАЗЫ

Спатрэбіцца: *крупы манныя — 100 г, вада — 300 мл, яйка — 1 шт., курынае філе — 300 г, морква (сярэдняя) — 1 шт., цыбуля рэпчатая — 1 шт., зяленіва кропу, пятрушкі — на смак, алей — 3 ст. л., масла — 20 г (па жаданні), соль і перац чорны молаты — на смак, сухары паніровачныя, алей для смажання.*

Гатуем густую манную кашу з дадаваннем каліва солі. Манныя крупы ўсыпаем тонкім струменьчыкам у кіпень і варым 2-3 хвіліны пры пастаянным памешванні. У злёгку астылую кашу ўбіваем курынае яйка і добра ўсё змешваем да аднастайнасці. Даём астыць маннаму цесту пад накрыўкай. Перад фарміраваннем зразаў злёгку размінаем цеста лапаткай.

Моркву надзіраем на тарцы, цыбулю рэжам кубікамі. На патэльні з алеем злёгку прыпускаем агародніннную нарэзку на працягу 2-3 хвілін. Для водару добра дадаць да гародніны кавалачак масла, але гэта неабавязкова.

Курыную грудзінку загадзя адварваем у невялікай колькасці вады, астуджваем у булёне і перакручваем мякаць праз мясарубку.

Да тушанай гародніны высыпаем перакручаны курыны фарш і грэем на сярэднім агні прыкладна 3-4 хвіліны. Выкладваем курыны фарш з гароднінай у міску і даём астыць. Запраўляем соллю і молатым перцам на смак, дадаём нарэзанае зяленіва. Калі начынка атрымліваецца сухаватай, можна дадаць у яе некалькі лыжак курынага булёну ці вяршкоў.

Рукамі, змочанымі ў халоднай вадзе, з маннага цеста фарміруем аладкі таўшчынёй прыкладна 0,5 см і выкладваем на сярэдзіну лыжку начынкі. Злучаем краі аладкі над начынкай, надаём зразам авальную форму і паніруем іх у молатых сухарах.

Абсмажваем зразы на алеі з абодвух бакоў да румянай скарынкі.

Падаём з любой любімай падліўкай або са смятанай. У якасці гарніру выдатна падыдзе салата са свежай гародніны або агароднінная нарэзка.

ДАРЭЧЫ. *Манныя зразы можна прыгатаваць і салодкімі, і салёнымі — залежыць ад начынкі. Салодкія — з начынкай з размякчаных сухафруктаў (разынкі, чарнасліў, фінікі, курага і іншае).*

ВАРТА ВЕДАЦЬ

УВІЛЬГАТНІЦЬ ПАВЕТРА Ў ДОМЕ

У памяшканні з паніжанай вільготнасцю чалавек адчувае дыскамфорт: сохнуць скура і валасы, з'яўляецца кашаль і пяршэнне ў горле. Таксама гэта шкодна для пакаёвых раслін. Таму ў ацяпляльны сезон вельмі важна ўвільгатняць паветра.

Самы просты спосаб — купіць адмысловы ўвільгатняльнік. Але калі не хочацца расходаў на прыбор, проста павесьце на батарэю вільготную анучу, апусціўшы кончык тканіны ў ёмістасць з вадой.

Таксама для ўвільгатнення паветра можна кіпяціць ваду ў каструлі. Дадайце ў яе лупінкі апельсіна, гваздзіку, эфірны алей эўкаліпта — і паветра напоўніцца прыемным пахам.

ПАРАДЫ БЫВАЛЫХ

ЯК ХУТКА ПРЫБРАЦЦА Ў ШАФЕ

Шарсцяныя світары, камізэлькі, сукенкі і іншыя цёплыя рэчы займаюць шмат месца ў шафе. Калі ўсе паліцы ўжо запоўненыя і стала цяжка падбіраць уборы, змясціце частку світараў на вешалкі. На фота паказана, як зрабіць гэта так, каб не расцягнуць плечыкі. Складзіце світар напалову, прасуньце рукавы праз адтуліну вешалкі, а астатнюю частку проста перакіньце на той жа бок.

ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ

РУКАВІЦЫ СА СВІТАРА

Дома заваляўся стары шарсцяны світар? Пашыйце з яго стыльныя рукавіцы!

Прыкладзіце далонь да краю світара, дзе знаходзіцца гумка, і абвядзіце маркерам, каб атрымаўся сілуэт рукавіцы. Калі вязка тоўстая, лепш спачатку зрабіць папяровую выкрайку. Затым выражце гатовыя дэталі, пакінуўшы прыпускі на швы, і сшыйце кавалкі тканіны паміж сабой.

Калі матэрыял моцна абсыпаецца, скарыстайцеся клеявым пісталетам. Па жаданні ўпрыгожце выраб пацеркамі або аплікацыяй. Цёплыя рукавіцы гатовыя!

Са старога світара можна таксама пашыць вусцілкі для абутку ці канапную падушку.

ХОЦЬ ЗА СТАРЦА, АБЫ Ў ДЗЕЎКАХ НЕ ЗАСТАЦЦА (Беларуская народная прымаўка).

Аляксандр ЗІНКЕВІЧ:

«Жыццё твораў не заканчваецца на выстаўках»

Два вялікія мастацкія праекты — адзін за адным — у Палацы мастацтва паказалі, наколькі мы стаміліся ад жыцця ў ізаляцыі. Праўда, арганізатары «Арт-Мінска» і «Восеньскага салона з Белгазпрамбанкам» разумелі, наколькі рызыкуюць, ладзячы іх адзін за адным, бо глядач павінен «засумаваць» па выстаўках. Аказалася, што рызыка ў іншым, бо выстаўкі паказалі, наколькі мы засумавалі па зносінах адзін з адным. Засумавалі па рэфлексіі на рэчаіснасць, без якой складана дбаць пра развіццё чалавека. А як гэтыя гады паўплывалі на развіццё мастацтва? Чым пагражае творчаму працэсу новая рэчаіснасць? У дырэктара сталічнага Палаца мастацтва Аляксандра Зінкевіча ёсць адказы на гэтыя пытанні:

— Пандэмія стала нечаканым выпрабаваннем, асабліва спачатку было складана, калі не было разумення, што далей. Гэта ў пэўным сэнсе дэмаралізуе і наведвальнікаў, і арганізатараў. У нас на першую хвалю пандэміі прыйшлася буйная выстаўка «Дарогамі нямецкага мастацтва». Яна доўга рыхтавалася, і першы тыдзень прайшоў вельмі паспяхова. А потым страх перад незразумелай хваробай практычна абнуліў усе нашы намаганні. Тады была першая горыч ад страты знакавага для Мінска праекта. Наогул ніхто не мог думаць, што пандэмія, самаізаляцыя могуць вызначыць новую рэчаіснасць. Хоць тэндэнцыя да самаізаляцыі людзей назіралася і да таго, пандэмія яе толькі фармалізавала. Бо людзі і раней як бы сыходзілі ад рэальнага свету, калі сталі больш часу праводзіць у віртуальным свеце. Яны нібыта добраахвотна самаізаляваліся, і гэта сусветная тэндэнцыя. Вось як нам з гэтым змагацца?

Ёсць два шляхі. Першы: прыняць гэты новы свет і сыходзіць у анлайн, нават культурным інстытуцыям, стваральчы праекты, якія дазваляюць дыстанцыйна знаёміцца з творамі мастацтва. Другі: рабіць цікавыя праекты, якія захапляюць людзей і прымушаюць іх выходзіць у рэальную прастору. Многія вялікія мастацкія музеі цяпер актыўна закладваюць гісторыю анлайн-наведванняў, ёсць адчуванне, што нават у перыяд пост-пандэміі новы фармат наведванняў будзе актыўна развівацца. Але я з цяжкасцю ўяўляю тэхналогію, няхай і прасунутую — дапоўненай рэальнасці — якая дазволіць адчуць твор мастацтва ў поўнай меры. Але калі з'явіцца значная група людзей, якія стануць анлайн-наведвальнікамі, то музеі ці іншыя ўстановы таксама будуць выконваць сваю місію па знаёмстве чалавека з культурай — дыстанцыйна або праз мультымедыйныя рашэнні.

З іншага боку, у дапандэмічны перыяд мы назіралі на прыкладзе расійскіх музеяў, што расце цікавасць да наведвання вялікіх музейных выставак. Нават па апошнім «Арт-Мінску» мы ўбачылі, што яго наведала каля 28 тысяч чалавек — гэта ўнікальныя лічбы для Беларусі, для выстаўкі сучаснага мастацтва. Адпаведна, такая тэндэнцыя паволі прыходзіць у беларускую рэчаіснасць. Складана сказаць, калі гэты фантастычны перыяд наступіць, бо цалкам верагодна, што будзе чацвёртая, пятая ці адзінаццатая хваля ковіду, а нам давядзецца гэта прыняць і шукаць новыя методыкі, якія змогуць манетызавацца. Зразумела, што культура ў пэўнай ступені датуецца дзяржавай, але мы знаходзімся на поўным самазабеспячэнні, таму трэба шукаць ідэі новых праектаў і новыя формы прыцягнення гледачоў. Цяпер ідзе такі пошук, і, магчыма, сёння закладваецца новая сістэма каналаў камунікацыі.

— Але жывыя зносіны з мастацтвам — калі ты адчуваеш яго з усіх бакоў, прыходзячы ў залу...

— Поспех любой выстаўкі грунтуецца на некалькіх кітах. Гэта ўласна мастацтва, якое прадстаўлена аўтарам, памножана і дапоўнена думкай куратара, экспазіцыйнай работай. І яшчэ важны момант прасоўвання выстаўкі. Калі мы гаворым менавіта аб узаемадзеянні экспазіцыянера і мастацкага матэрыялу — гэта асобнае мастацтва, асобны талент. Любы добры мастацкі матэрыял можна знішчыць дрэнным экспанаваннем і наадварот — работы нават сярэдняга ўзроўню можна прадставіць вельмі дастойна. Мне здаецца, поспех і цікавасць гледачоў таго ж «Арт-Мінска» звязаныя менавіта з тым, што дастойна прадстаўлены добры, якасны, цікавы, разнастайны мастацкі матэрыял.

Іншая справа, што ёсць пытанні на будучыню, але яны ў большай ступені датычацца матэрыяльнага дастатку.

— На «Восеньскі салон» было пададзена шмат заявак — магчыма, гэта таксама вынік стомленасці ад ізаляцыі, ці актывізавалася наша творчая эліта?

— Сама па сабе яна не актывізавалася. Мы з году ў год фарміруем вялікую базу, выбудоўваем праект не як разавую з'яву. Актыўна запрашаем мастакоў, робім маштабныя рассылкі. На гэтыя два праекты мы стараемся максімальна стымуляваць мастацкую актыўнасць. Дзякуючы нашым партнёрам пераможцы «Арт-Мінска» (іх было каля 30 чалавек) атрымалі добрыя прызы, што для іх было нечакана. Але гэтыя выстаўкі выйшлі за межы матэрыяльнай зацікаўленасці.

Не магу сказаць, што беларуская мастацкая прастора пасіўная. Тэмы, якія выбіраюць мастакі, шмат у чым вызначаюцца навакольным светам. Яны фіксуюць і прапануюць водгук на падзеі, якія адбываюцца ў рэальнасці. Бо мастак — гэта арганізм, які тонка адчувае жыццё. Людзі ствараюць цікавыя творы, іншая справа, што трэба выбудаваць з імі камунікацыю, пастаянна нагадваць ім аб неабходнасці ўдзелу ў выстаўках, паказваючы прыклады ў тым ліку і актыўнасці гледачоў. Таму што для мастака вельмі важна, каб яго творы набываліся ці прыцягвалі глядацкую ўвагу.

— Якога мастацтва сёння чакае глядач? Прыгожасці, каб здабыць унутраную гармонію? Ці ён чакае думкі, нейкай яршыстасці, асабліва ад моладзі?

— У нас ёсць глядацкае галасаванне, але казаць пра перавагі публікі складана. Гэта можа быць цікавасць да інсталяцыі сацыяльнай скіраванасці. Гэта могуць быць і нацюрморты ці гіперрэалістычныя работы Алесі Скарабагатай. Галоўнае, каб мастацтва было ўнікальнай з'явай, а не стварала пэўны паўтор, нейкае капіраванне. Той жа пейзаж можа быць з'явай унікальнай, як у Аляксандра Даманава, а можа быць трывіяльнай, што людзі бачылі не раз. Таму не прыходзіцца казаць пра выразны трэнд на праблемна-сацыяльнае мастацтва або на тое, што ўлагоджвае.

— А чаго чакае моладзь? Яе, відаць, больш складана знаёміць з мастацтвам...

— Трэці элемент пасля зместу і стварэння экспазіцыі — прасоўванне, тут надзвычай важны. Цяпер мы знайшлі даволі эфектыўныя каналы камунікацыі, менавіта таму «Восеньскія салоны» і «Арт-Мінск» прыцягваюць новую хвалю гледачоў. Чаго маладыя людзі жадаюць? Мне падаецца, і тут не ўсё адназначна. Яны чакаюць цікавага баўлення часу. Яны жадаюць разважанняў пра творы. Яны хочуць знайсці адказы на пытанні па сур'ёзных сацыяльных тэмах. Яны ідуць, каб зрабіць цікавае сэлфі. Як у жыцці: хтосьці канцэнтруе сваю ўвагу на глыбокіх рэчах, хтосьці жадае захаваць жыццё ў моманце. Мы цяпер фактычна фарміруем новае пакаленне гледачоў, якія бачаць, што наведванне выставачных прастор — гэта прывабная магчымасць цікава правесці час. Мы заўсёды казалі аб тым, што канкурыруем не паміж выставачнымі залами, а з кафэ, з кінатэатрамі і ў прынцыпе з любымі іншымі формамі баўлення вольнага часу. Вось і цяпер мы паказалі ў тым ліку і самі сабе, што, падбіраючы цікавыя, шматпланавыя і зразумелыя рознай аўдыторыі творы (а мы даволі шырока прэзентуем беларускае мастацтва, імкнучыся пазбягаць зашоранага погляду, запрашаем мастакоў розных пакаленняў, стыляў, жанраў), выхоўваем новае пакаленне гледачоў, якія атрымліваюць пазітыўны досвед узаемаадносін з мастацтвам. Мне здаецца, наша моладзь адукаваная, цікавіцца жыццём ва ўсіх яго праявах. Таму ў мяне няма песімізму пры знаёмстве з гледачамі новага пакалення.

— Выстаўкі-продажы прадугледжваюць наяўнасць кліента. Як з гэтым цяпер?

— Апошнія два гады для галерэйнай справы не самыя ўдалыя, але «Арт-Мінск» і «Салон» паказалі нядрэнныя вынікі. Іншая справа, што на пэўнай мяжы яны застылі, і цяпер трэба працаваць, каб вывесці продажы на якасна новы ўзровень. Але гэта лагічны паказчык таго, як цяпер пачуваецца галерэйны бізнес: два мінулыя гады для яго шмат у чым сталі выпрабаваннем. Бо закрыліся граніцы, іншаземных наведвальнікаў у краіне стала значна менш. Ва ўсім свеце ў людзей упалі даходы, а прадметы мастацтва ўсё ж не адносяцца да першачарговых пакупак. Гэта вельмі цікавы і перспектыўны від дзейнасці, але трэба разумець, што мы не гаворым аб набытках, якія адбываюцца ў перыяд лішку сродкаў, а не ў моманты глабальных фінансавых выпрабаванняў.

Таму трэба думаць, як пашыраць камунікацыю ў гэты перыяд. Калі з мастакамі і гледачамі мы яе наладзілі, то цяпер стаіць пытанне, як кантактаваць з патэнцыйнымі пакупнікамі. Пашырэнне кліенцкай базы — пытанне ўжо нашага прафесійнага росту. Але мне здаецца, што гэтыя два праекты ідуць правільнай дарогай, яны шмат у чым сталі стрыжнем выставачнага жыцця не толькі галерэі Палаца мастацтва, але Мінска і Беларусі.

— Цяпер не самы лепшы час для пакупак, а пры гэтым мастакі трымаюць цэны на высокім узроўні, як быццам не было гэтых двух гадоў... У дадзеным выпадку кошт — гэта частка іміджу?

— Мы ўвесь час кажам пра тое, што ёсць пакупніцкія магчымасці, і ёсць запыты мастакоў. Пошук збалансаванага значэння — ключавы для развіцця рынку мастацтва. Заяўленыя цэны ў пэўным сэнсе — пазіцыя аўтараў. Пакупнік можа агучыць сваю пазіцыю, часам яны могуць прыйсці да паразумення, тады і ажыццяўляецца продаж. Часам работы аўтараў зразумелыя і даступныя — такія прапановы прадаюцца ў першую чаргу. Далей уключаецца камунікацыя паміж кліентам і мастаком, чаму мы садзейнічаем, таму што для нас канчатковая цана продажу важная ў меншай ступені, чым сам факт продажу. Мы не на баку пакупніка і не на баку мастака, мы прыкладаем усе сілы, каб была сфарміравана разумная цана твора.

Магчыма, выхад на замежныя рынкі дазволіць мастакам, чые цэны для беларускага рынку высокія, знаходзіць сваіх пакупнікоў. У рэшце рэшт, нельга судзіць аўтара за тое, што ён высока цэніць свае творы. Іншая справа, што выстаўка-продаж — гэта не выстаўка-купля.

Мы актыўна не ўмешваемся, толькі часам рэкамендуем цэнаўтварэнне, але не цэнзуруем мастакоў.

— Гэта значыць, цікавасць да набыцця мастацтва ў нас ёсць?

— Безумоўна. Але ні адзін нацыянальны рынак не існуе сёння ў адрыве ад рынку сусветнага. Асноўныя перспектывы дарагіх пакупак для беларускіх мастакоў звязаныя з прэзентацыямі іх у сусветнай прасторы. Мы павінны ісці з прапановамі туды, дзе ёсць калекцыянеры і фінансавыя магчымасці. Перспектывы развіцця рынку мастацтва — у яго інтэграцыі ў міжнародны рынак. «Арт-Мінск» у дапандэмійную пару і рабіў упор на тое, каб крок за крокам інтэгравацца ў прастору міжнародных арт-кірмашоў. Актыўная работа з нацыянальным рынкам не супярэчыць таму, каб прэзентаваць сябе рынку сусветнаму. Хоць нацыянальныя мастакі часцей за ўсё зразумелыя свайму пакупніку, але наш рынак — з не самым высокім сярэднім прыбыткам на душу насельніцтва. І ўсё ж трэба прэзентаваць дома якаснае беларускае мастацтва. «Арт-Мінск» і «Восеньскі салон» у гэтым сэнсе ўжо сталі самадастатковымі з'явамі з гісторыяй. А мне падаецца, што і з будучыняй.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Анонс

ШТО ПРАЧЫТАЕМ У «ПОЛЫМІ» Ў 2022 ГОДЗЕ?

Пра гэта нам расказалі ў выдавецтве «Мастацкая літаратура», якое з'яўляецца выдаўцом найстарэйшага літаратурна-мастацкага часопіса краіны. Дарэчы, у 2022 годзе апошняму спаўняецца 100 гадоў.

«Палымянцы» абяцаюць надрукаваць невядомыя дагэтуль вершы Канстанцыі Буйло, прысвечаныя народнаму песняру Беларусі Янку Купалу. Чытач адкрые для сябе і старонкі заканчэння рамана акадэміка Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі Уладзіміра Гніламёдава «Праўда жыве пасярэдзіне».

З новых твораў прозы ў часопісе будуць змешчаны аповесці і апавяданні Георгія Марчука, Уладзіміра Гаўрыловіча, Віктара Гардзея, Алеся Бадака, Віктара Праўдзіна, Людмілы Рублеўскай, Раісы Баравіковай, Васіля Ткачова, Алены Брава, Адама Глобуса, Уладзіміра Мажылоўскага, Яўгена Хвалея, Ганада Чарказіна, Наталлі Дземідовіч.

Аматары паэзіі сустрэнуцца з вершамі Міколы Маляўкі, Віктара Гардзея, Міколы Мятліцкага, Генадзя Пашкова, Міхася Пазнякова, Міхася Башлакова, Уладзіміра Мазго, Людмілы Кебіч, Алеся Казекі, Міколы Шабовіча, Соф'і Шах. Па традыцыі будуць надрукаваны і пераклады сучаснай паэзіі і прозы аўтараў з далёкага і блізкага замежжа.

Адметнасць выдання — раздзелы літаратуразнаўства, літаратурнай крытыкі, архіўныя публікацыі. Свае артыкулы аддалі ў рэдакцыю ці спланавалі прынесці ў «Полымя» ў 2022 годзе дасведчаныя вучоныя, літаратуразнаўцы — Іван Саверчанка, Мікола Мікуліч, Яўген Гарадніцкі, Ігар Шаладонаў, Валерый Максімовіч, Уладзімір Каротка, Алесь Бельскі, Іван Штэйнер, Васіль Старчонак, Любоў Ляўшун, Уладзімір Чарота.

Анансуе «Полымя» і публікацыю дзённікавых запісаў аўтара «Старажытнай Беларусі», легендарнага беларускага гісторыка Міколы Ермаловіча. Будуць змешчаны і лісты дачкі Адама Бабарэкі Алесі Бабарэкі да краязнаўца Сяргея Чыгрына, а таксама «Запіскі этнографа» Сяргея Сахарава. Несумненна, цікавасць чытачоў павінна выклікаць і ліставанне мастака, паэта, настаўніка Юльяна Сергіевіча з дзеячамі беларускай культуры.

Мікола БЕРЛЕЖ.

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества Автотранспортного унитарного предприятия «Забудова-Автотранс»

Лот	Наименование	Местонахождение	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	1. Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-50532, площадь 3 128,3 кв. м, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – здание ремонтных мастерских	Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, 8/1, вблизи п. Чисть	278 244,90	27 824,49	13 912,25
	2. Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-19265, площадь 964,5 кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, хранилищ, наименование – административно-бытовой комплекс	Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, 8, вблизи п. Чисть			
2	Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-54920, площадь 56,2 кв. м, назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – здание автозаправочной станции на 120 заправок; с составными частями и принадлежностями согласно техническому паспорту	Минская обл., Молодечненский р-н, Красненский с/с, 8, вблизи д. Плебань	74 455,34	7 445,53	744,55

В отношении лота № 1 проводятся шестые повторные торги. **Стоимость снижена на 85 %.** Ранее объявление размещалось в газете «Звязда» № 88 (29457) от 13.05.2021, № 124 (29493) за 02.07.2021, № 145 (29514) от 31.07.2021, № 162 (29531) от 25.08.2021, № 176 (29545) от 14.09.2021, № 195 (29564) от 11.10.2021, стр. 15. **В отношении лота № 2** проводятся четвертые повторные торги. **Стоимость снижена на 60 %.** Ранее объявление размещалось в газете «Звязда» № 131 (29500) от 13.07.2021, № 162 (29531) от 25.08.2021, № 176 (29545) от 14.09.2021, № 195 (29564) от 11.10.2021, стр. 15

Сведения о земельном участке: Лот № 1 расположен на земельном участке площадью 3,7752 га с кадастровым номером 623886007698000001 по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, 8, вблизи п. Чисть. Назначение – земельный участок под производственную зону в п. Чисть Молодечненского района. Предоставлен на праве постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Лот № 2 расположен на земельном участке площадью 1,1565 га с кадастровым номером 623881700098000009 по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Красненский с/с, 8, вблизи д. Плебань (целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания автозаправочной станции) а также земельные участки с кадастровыми номерами: 623800000098006032, (0,0001 га), 623800000098006031 (0,0015 га), 623800000098006035 (0,0001 га), 623800000098006034 (0,0006 га), 623800000098006039 (0,0001 га), 623800000098006038 (0,0001 га), 623800000098006037 (0,0001 га), 623800000098006033 (0,0001 га), 623800000098006036 (0,0001 га), 623800000098006040 (0,0001 га), 623800000098006041 (0,0001 га), 623800000098006042 (0,0001 га), на которых расположены составные части объекта. Земельные участки предоставлены на праве постоянного пользования. Переход прав на земельные участки осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

Обременения (ограничения)	Лоты №№ 1, 2 имеют обременение в виде ипотеки, правообладатель – ОАО «Белвнешэкономбанк». По вопросам обременений обращаться по тел. +375293953088 (Илья)
Дата и время проведения торгов	**17 ноября 2021 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.30)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127
Срок приема заявлений и оплаты задатка	с 10.00 **4 ноября 2021 года** до 16.00 **15 ноября 2021 года**

Условия для участия в торгах:
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с BY36ALFA30122215570040270000, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по Лоту __, УП «Забудова-Автотранс», проводимых 17.11.2021.
2. Заявления на участие и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах, копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта; копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления являются дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). Контактное лицо по вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе – Анаида (+375 29 308 28 97).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете «Звязда») на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста составляет 7 % (семь процентов) от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 30 (тридцати) календарных дней со дня подписания (заключения) договора купли-продажи. В случае совершения просрочки обязательства по заключению договора купли-продажи и его оплате не по вине Покупателя указанные сроки могут быть продлены.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. По вопросу осмотра объектов обращаться к Борису Юрьевичу +375 29 326-16-12.
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи и перехода права собственности на объекты недвижимости осуществляется Покупателем самостоятельно за свой счет.

Информация о продавце	**Автотранспортное унитарное предприятие «Забудова-Автотранс» в лице ликвидатора – ООО «ФИБЛ» (Минская обл., Молодечненский р-н, п. Чисть, ул. Заводская, 4, УНП 600468334)**
Организатор аукциона	**ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg**

ООО «СпецРеализация»

объявляет о проведении четвертых повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «ТРИУМФСТРОЙ» (УНП 190465926, г. Минск, ул. Л. Украинки, д. 16, каб. 6), находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)

***Дата и время проведения торгов*: 18 ноября 2021 года**.
Начало – 10.00.
Заявки принимаются с 04 ноября 2021 года по 17 ноября 2021 года.
Место проведения торгов: г. Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».
Организатор торгов: ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.
Продавец: **ООО «ТРИУМФСТРОЙ» (УНП 190465926)** в лице антикризисного управляющего – директора частного предприятия «Правовая компания «БелПрофКонсалт» Комса Инги Анатольевны, тел. 8 (029) 133-01-01.

№ лота	Предмет торгов	Начальная цена, рублей без учета НДС	Шаг торгов	Задаток
1	**Изолированное помещение, инв. номер по ЕГРНИ 500/D-708161404,** назначение – машино-место, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Жуковского, 29Б-149, площадь – 13,2 кв. м	**6 870,00**	**5 %**	**5 %**
2	**Изолированное помещение, инв. номер по ЕГРНИ 500/D-708161398,** назначение – машино-место, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Жуковского, 29Б-150, площадь – 13,1 кв. м	**6 870,00**	**5 %**	**5 %**
3	**Изолированное помещение, инв. номер по ЕГРНИ 500/D-708161400,** назначение-машино-место, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Жуковского, 29Б-152, площадь – 13,3 кв. м	**6 870,00**	**5 %**	**5 %**

Для участия в торгах необходимо:
1. В срок до 16.00 **17 ноября 2021 года** перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY98PJCB30123042861000000933 в ОАО «Приорбанк», код PJCBBY2X, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация».
2. Подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 16.00 17.11.2021 заявление на участие в торгах с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по адресу: Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41. Контактное лицо для осмотра лотов: Яскевич Дмитрий Васильевич, тел. 8 (029) 684-71-76.
3. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.
Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.
Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.
Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.
Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае, если:
- заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;
- на торги явился один из участников, либо ни один из участников не явился.
В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить Организатору торгов установленное вознаграждение согласно заключенному соглашению в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 15 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.
Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен (будет в последующем установлен) собранием (комитетом) кредиторов.
Сведения о предыдущих торгах:
РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 69 (29438) за 14.04.2021.
РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 113 (29482) за 17.06.2021.
РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 146 (29515) за 03.08.2021.
РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 176 (29545) за 14.09.2021.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5**
Продавец	**ОАО «АЛЕВКУРП». Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 1А, эт. 4, комн. 17**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46**
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов (одним лотом)
Адрес: Минская обл., Червенский р-н, Смиловичский с/с, 4, район д. Гудовичи

Производственная база в составе **9 незавершенных законсервированных капитальных строений (здание и 8 сооружений, в т. ч. газопровод высокого давления, сети 10Кв и сети связи):**

- инв. номер 615/U-43081, общ. пл. 461,8 кв. м, составные части: мансардный и цокольный этажи, проезды и площадки, ограждение;
- инв. номер 615/U-43084, общ. пл. 1995,6 кв. м, составные части: газопровод высокого давления А, ШРП а1, технологич. оборудование*;
- **инв. номер 615/U-43088**, общ. пл. 168,8 кв. м, составные части: дожд. сток, направляемый на очистку, трубопровод очищенного стока, локал. очист. сооружения дождевого стока, технологич. оборудование*;
- **инв. номер 615/U-43089**, общ. пл., 7 кв. м, составные части: подземная насосн. станция на скважине, скважина;
- **инв. номер 615/U-43082**, общ. пл. 3 кв. м, составные части: подземная насосн. станция на скважине, скважина;
- **инв. номер 615/U-43087**, общ. пл. 307,4 кв. м, составные части: сеть быт. канализации, локальные очист. сооружения быт. стока, КНС, технологич. оборудование*;
- **инв. номер 615/U-43083**, общ. пл. 192,3 кв. м, составные части: сеть противопож. водопровода, трубопровод условно-чистых вод, подзем. насосн. станция пожаротушения, пож. резервуары 5 шт., технологич. оборудование*;
- **инв. номер 615/U-43086**, общ. пл. 113,9 кв. м, составные части: сеть хозяйст. водопровода, сеть водопровода подземной воды;
- **инв. номер 615/U-43085**, общ. пл. 19,9 кв. м, составные части: ТП, внутриплощадные сети электроснабжения, технологич. оборудование*.
В состав лота входят **сети 10Кв** (в том числе технологич. оборудование*) и **сети связи.**
** Перечень технологич. оборудования, входящего в состав лота, см. на сайте организатора торгов www.cpo.by или на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by*

Сведения о земельном участке: пл. **1,9103 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 11.07.2064) для строительства и обслуживания производственной базы. Ограничения (обременения) прав: расположенные на иных территориях (мелиорированные земли), площадь 0.0800 га

Начальная цена с НДС 20 % – 1 101 720,00 бел. руб.
(снижена на 48 %)

Задаток 5 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установленны регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Извещение о проведении аукциона было опубликовано в газете «Звязда» от 22.09.2021

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов: 16.11.2021 в 11.00. Окончание торгов: 16.11.2021. в 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 15.11.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06
E-mail: auction@cpo.by

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга» (Продавец)

Лот № 1: Незавершенное законсервированное капитальное строение, инв. № 500/U-65431, площадь (по данным тех. паспорта) – 5 218,6 кв. м, г. Минск, ул. Пономаренко, 7/12.

Начальная цена с НДС – 1 891 000,00 руб.
Задаток – 189 100,00 руб.
Земельный участок 500000000006000098, 7,6447 га.
Право постоянного пользования.
Аукцион состоится **06.12.2021 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. **Шаг аукциона** – 5 %.
Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.** *Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 ОАО «Белагропромбанк», БИК BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.*
Окончание приема заявлений и задатков – **02.12.2021 в 11.00**.

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

ХАЛОДНЫЯ ГУЛЬНІ

Што чакае ўкраінцаў узімку?

Ва Украіне ў найбліжэйшы час адбудзецца масавае закрыццё сацыяльных аб'ектаў, а насельніцтва пяройдзе на ацяпленне кізякамі (сушаным гноем), лічыць кіраўнік Незалежнага прафсаюза шахцёраў Украіны, дэпутат Вярхоўнай рады Міхаіл Валынец. Паводле яго слоў, гэта здарыцца з-за недахопу энергарэсурсаў. «Трэба папярэдзіць людзей, каб у сельскай мясцовасці хаця б кізякі збіралі і сушылі. Таму што трэба спадзявацца толькі на сябе, а не на такую ўладу», — сказаў парламентарый у эфіры тэлеканала «Наш». Як вядома, сёлета ва Украіне тарыфы на цяпло і гарачую ваду вызначаюць мясцовыя адміністрацыі, а не цэнтральная ўлада. У Хмяльніцкай, Адэскай, Закарпацкай, Львоўскай і Івана-Франкоўскай абласцях абвясцілі надзвычайную сітуацыю з-за недахопу блакітнага паліва для бюджэтных устаноў. У Кіеве дапусцілі абмежаванне спажывання электрычнасці ўзімку. Патавая сітуацыя складаецца таксама з вугалем. Кіраўнік украінскай партыі «Бацькаўшчына» Юлія Цімашэнка заявіла, што ў краіне разгортваецца поўнамаштабны энергетычны крызіс. На яе думку, неабходна ўвесці надзвычайнае становішча ў энергетыцы. Што ж чакае ўкраінцаў падчас ацяпляльнага сезона?

ГАЗАВАЯ «АРЫФМЕТЫКА»

Украінская ўлада па-ранейшаму не можа вырашыць два жыццёва важныя пытанні: дзе ўзяць газ і дзе ўзяць на яго грошы, піша ўкраінская газета «Вести».

З-за высокіх цэн на блакітнае паліва мясцовыя Саветы па ўсёй краіне адзін за адным аб'яўляюць надзвычайную сітуацыю. Але куды больш трывожна выглядае фізічны недахоп энергарэсурсаў — як газу, так і вугалю. У такіх умовах, як адзначаюць эксперты, нават двухтыднёвыя маразы могуць абярнуцца халоднымі батарэямі і веернымі адключэннямі святла. Улады тым часам ужо складаюць аварыйныя планы адключэнняў паставак рэсурсаў для прамысловых прадпрыемстваў.

Ледзь еўрапейцы змаглі ачомацца пасля рэкорднага за ўсю гісторыю росту цэн на газ, як з'явілася новая праблема — яго фізічны дэфіцыт. Сезон запампоўвання блакітнага паліва змяніўся сезонам адбору. Як вынік, Еўропа пачала адбіраць з падземных сховішчаў больш газу, чым туды запампоўваць. Пры гэтым узровень запасаў у еўрапейскіх ПСГ знаходзіўся на гістарычна мінімальным узроўні (77 працэнтаў), што на 14 пунктаў ніжэй за сярэдні паказчык за апошнія пяць гадоў.

Для Украіны, якой запасаў газу нібыта і хапае для праходжання халадоў «на мінімалках», сітуацыя ў Еўропе ставіць пад сумненне ў выпадку моцных халадоў магчымасць аператыўнага імпарту патрэбнага аб'ёму газу. Так, напрыклад, паводле даных «Нафтагазу», ва ўкраінскія ПСГ на стане на сярэдзіну кастрычніка было запампавана 18,7 мільярда кубоў газу. У той час як для праходжання ацяпляльнага сезона патрэбна 13 млрд куб. Але тут ёсць адзін важны нюанс: газ ва ўкраінскіх ПСГ не ў поўным аб'ёме належыць дзяржаве.

«У нас каля 4 млрд куб. м газу ў падземных сховішчах нерэзідэнтаў. Яны афіцыйна заявілі, што пачынаюць яго адбіраць. У кастрычніку ў іх у планах было адабраць 500 млн куб. м газу. Прычым на продаж у ЕС, а не ва Украіну, як нам гаварылі. Яшчэ 4,6 мільярда кубоў — гэта тэхнічны газ. У выніку нам застаецца 9,5—10 мільярдаў кубоў газу. І тое структура ўласнасці астатняга газу — гэта таямніца «Нафтагазу» за сямю пячацямі. Верагодна, што сярод яго яшчэ нейкая колькасць належыць рэзідэнтам, няхай 1 млрд куб. м. Адпаведна, можна зыходзіць з таго, што застаецца 8 млрд куб. м газу. А яшчэ ёсць 3 млрд — гэта страхавы запас. Гэта газ апошняй надзеі, які «Нафтагаз» не мае права адбіраць. У сухім астатку ў аператыўным спажыванні знаходзіцца каля 5 млрд куб. м. А для праходжання ацяпляльнага сезона трэба 13 млрд», — расказаў «Вестям» энергетычны эксперт Валянцін Зямлянскі. Такая вось несуцяшальная газавая «арыфметыка». Таму, паводле меркавання эксперта, для паспяховага праходжання асенне-зімовага перыяду Украіне, верагодна, давядзецца дакупляць значныя дадатковыя аб'ёмы.

Не схільны да аптымізму і кіраўнік Усеўкраінскай энергетычнай асамблеі, колішні міністр паліва і энергетыкі Украіны Іван Плачкоў. Паводле яго слоў, праблемы ў энергетычным комплексе могуць пачацца, калі тэмпература паветра апусціцца да 12—15 градусаў марозу і пратрымаецца так на працягу двух тыдняў. «Мы будзем або адбіраць з трубы (газ, які Украіна транспартуе ў Еўропу), або павінны купляць у Славакіі», — адзначыў Іван Плачкоў.

Пры гэтым, як заўважыў энергетычны эксперт Дзмітрый Маруніч, калі Еўропу накрыюць працяглыя маразы, то вялікая верагоднасць таго, што ўзяць дадатковыя аб'ёмы газу проста не будзе адкуль. «Калі будзе халодная зіма, то ёсць усе рызыкі перабояў з забеспячэннем газам краін Усходняй Еўропы, асабліва тых, у якіх няма ўласнага рэсурсу. Лагічна выказаць меркаванне, што калі ў Цэнтральнай Еўропе не будзе хапаць газу, то, адпаведна, і па рэверсе ва Украіну можа нічога не трапіць. Проста фізічна пампаваць не будзе чаго. Плюс спад аб'ёмаў уласнай здабычы нясе дадатковыя рызыкі», — сказаў Дзмітрый Маруніч.

НАДЗВЫЧАЙНАЯ СІТУАЦЫЯ

Тым часам улады традыцыйна поўныя аптымізму, спадзяюцца на ЗША і прапаноўваюць вельмі нестандартныя варыянты вырашэння праблемы. Так, напрыклад, кіраўнік праўлення «Нафтагазу Украіны» Юрый Вітрэнка заявіў, што ў выпадку крызісных сітуацый Украіна будзе браць газ «з трубы». «Калі нам раптам не будзе хапаць 20—30 мільёнаў кубоў у суткі, то, па-першае, нашы магутнасці па імпарце з Еўропы складаюць 30—60 млн куб. м. А, па-другое, калі мы рыхтуемся да халадоў, то запампоўваем у трубу крыху больш газу. А потым, калі ідуць халады, мы можам змяншаць ціск і адбіраць уласны газ назад», — сказаў Юрый Вітрэнка.

Але сёння сітуацыя выглядае вельмі парадаксальна. Як адзначае экс-кіраўнік праўлення «Нафтагазу» Андрэй Кобалеў, замест імпарту газу Украіна яго экспартуе. «Па 15 мільёнаў кубаметраў газу за суткі ідзе ў напрамку Еўропы. Трэба зрабіць усё, каб гэта спыніць», — адзначыў Андрэй Кобалеў. Зрэшты, як заўважыў Дзмітрый Маруніч, у тым, што з Украіны пачаўся адток газу, няма нічога дзіўнага. «Трэйдары запампоўвалі газ яшчэ ў мінулым годзе па $100. Цяпер цана ў 10 разоў большая. Яны хочуць яго прадаць», — растлумачыў эксперт.

У той жа час пакуль газавыя трэйдары атрымліваюць звышпрыбыткі, у некаторых украінскіх абласцях мясцовыя ўлады абвясцілі надзвычайную сітуацыю з-за адсутнасці газу для ацяплення камунальных і бюджэтных устаноў. У прыватнасці, у Закарпацці на пазапланавым пасяджэнні рэгіянальнай камісіі па пытаннях тэхнагенна-экалагічнай бяспекі і надзвычайных сітуацый (ТЭБ і НС) прынялі рашэнне лічыць сітуацыю ў вобласці надзвычайнай. Так вырашылі ў сувязі з адсутнасцю паставак прыроднага газу бюджэтным установам на асенне-зімовы перыяд 2021—2022 гадоў. Становішча класіфікавалі як надзвычайную сітуацыю тэхнагеннага характару дзяржаўнага ўзроўню.

Паводле даных мясцовых улад, пастаўшчыкі, якія раней выйгралі таргі і заключылі дагаворы на пастаўку газу, цяпер адмаўляюцца гэта рабіць, спасылаючыся на рэзкі рост рыначных цэн на паліва. Надзвычайную сітуацыю з-за адсутнасці газу для бюджэтных устаноў увялі і ў Івана-Франкоўску. Як паведаміў у Facebook мэр горада Руслан Марцінкіў, без газу засталіся ўстановы аховы здароўя, школы і дзіцячыя сады. Аналагічнае рашэнне прыняла рэгіянальная камісія па пытаннях ТЭБ і НС у Хмяльніцкай вобласці. На Палтаўшчыне і ў Краменчугу таксама абвясцілі надзвычайную сітуацыю для падачы ацяплення. Падобная сітуацыя ў Чарнігаўскай, Адэскай і Днепрапятроўскай абласцях.

МЕНШ ЗА МІНІМУМ

Вельмі трывожная сітуацыя і з вугалем. «Штодня аб'ём толькі скарачаецца. Гэта катастрафічна мала. Трэба праводзіць растлумачальную работу. Мы павінны падрыхтавацца. Калі будуць пікавыя нагрузкі, каб не дапускаць веерных адключэнняў, мы павінны расцягнуць спажыванне, каб зменшыць гэтыя пікі. Магчыма, варта пераносіць пачатак працоўнага дня на вялікіх прадпрыемствах на розны час, падрыхтаваць графікі аварыйных адключэнняў і ўзгадніць іх на ўзроўні абшчын для абмежавання работы прамысловых прадпрыемстваў. Украіна — гэта не поўнач Францыі, тут зімы бываюць вельмі халодныя, у тым ліку з веернымі адключэннямі», — адзначыў Іван Плачкоў. На яго думку, адзіны варыянт нармальнага праходжання ацяпляльнага сезона — гэта набыццё вугалю ў «дзяржрэзерв». У той жа час ён выказаў сумненне ў здольнасці Украінскай чыгункі перавезці неабходны аб'ём паліва па прычыне недастатковай колькасці вагонаў.

У той жа час, як заявіў намеснік міністра энергетыкі Максім Нямчынаў, на ўзроўні ведамства ствараюцца спісы прадпрыемстваў, якім, верагодна, давядзецца абмежаваць падачу газу і электраэнергіі пры надыходзе крызісных з'яў. «Сітуацыя не вельмі простая. Мы разлічваем на стабільную работу атамнай генерацыі. Гэтай зімой будуць працаваць 13-14 блокаў, а ў выпадку неабходнасці і 15-ы. Я разумею, што гэта складана, але такі сцэнарый мы ўзялі ў разлік», — заявіў Максім Нямчынаў.

Пры гэтым напрыканцы мінулага тыдня стала вядома, што на складах як мінімум сямі цеплавых электрастанцый Украіны — Курахаўскай, Запарожскай, Прыдняпроўскай, Зміеўскай, Вуглегорскай, Трыпальскай, Славянскай — не выконваліся нормы гарантаваных запасаў вугалю. «Гэта мінімальныя запасы, якія абавязкова павінны быць захаваны згодна з умовамі вядзення ліцэнзійнай дзейнасці», — патлумачыў кіраўнік камітэта Вярхоўнай рады па пытаннях энергетыкі і ЖКП Андрэй Герус. Паводле даных кіраўніка Незалежнага прафсаюза шахцёраў Украіны Міхаіла Валынца, на складах цеплавых электрастанцый напрыканцы мінулага тыдня было 565 тысяч тон вугалю, што на 88 тысяч тон менш за мінімальна дапушчальны ўзровень. Сітуацыя, якая склалася, перакананы Валынец, будзе вельмі цяжкай для ўкраінскага насельніцтва і прамысловасці. У цэлым складанасці ў энергетычнай галіне, на думку кіраўніка прафсаюза шахцёраў, Украіна адчувае з 2014 года. Ён таксама выказаў меркаванне, што ўлада можа сутыкнуцца ў гэтым ацяпляльным сезоне са стыхійнымі пратэстамі насельніцтва з-за павышэння тарыфаў. Некаторыя рэгіёны ўжо паведамілі аб павышэнні цэннікаў на пастаўку энергарэсурсаў. У Чарнаўцах тарыфы на ацяпленне вырастуць на 70 %. У Кіеве і Палтаве за цяпло ў доме давядзецца плаціць на 40% больш. Адэса ўзняла тарыфы на 30 %, а Крамянчуг — на 53 %, а ў Вінніцы расцэнкі ўзрастуць на 25–30 %.

ПА СПІРАЛІ САМАРАЗБУРЭННЯ

Па словах Юліі Цімашэнкі, энергетычны крызіс ва Украіне паглыбляецца не толькі з-за некампетэнтнасці ўлады, але і карупцыйных махінацый з перапродажам украінскага газу. Наступствы гэтага крызісу адчуюць усе без выключэння грамадзяне і бізнес. «Мы ведаем, што сабекошт украінскага газу складае 1 грыўню, людзям яго прадаюць па 7, бюджэтнай сферы — па 13. Пасрэднікі апанавалі гэтую сістэму, і карупцыя сёння дасягнула апагею ў перапродажы ўкраінскага прыроднага газу. Для прамысловасці цана даходзіць да 50 грыўняў за кубаметр, таму літаральна праз месяц мы атрымаем цэны на прадукты харчавання і прадметы першай неабходнасці, якія будуць недаступныя для людзей. Інфляцыя дасягне самых высокіх узроўняў», — перасцерагла Юлія Цімашэнка.

Энергетычны крызіс ва Украіне перастае быць з'явай чыста эканамічнага характару і ўжо пачаў непасрэдна прыводзіць да гібелі людзей, адзначыў eadaily.com. Яскравым прыкладам падобнай трагедыі стаў выпадак у горадзе Бровары ў Кіеўскай вобласці, дзе загінула цэлая сям'я: маці і бацька сталага ўзросту і іх маладая дачка. Усе яны атруціліся ўгарным газам. Як пішуць украінскія СМІ, верагодней за ўсё ў кватэры загінулых яшчэ не ўключылі ацяпленне, і людзі спрабавалі сагрэцца з дапамогай газавай пліты альбо іншай прылады, магчыма, самаробнай. Раней партал «Грамадскі» паведаміў, што ва ўкраінскім горадзе Крапіўніцкі двухгадовая дзяўчынка атрымала пераахаладжэнне з-за адсутнасці ацяплення ў дзіцячым садку.

Па віне свайго палітычнага істэблішменту Украіна ідзе па спіралі самаразбурэння. Такое меркаванне выказаў старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Андрэй Савіных у эфіры YouTube-канала «Галоўны. Тур». Цяжка не пагадзіцца. Таму маразоў украінцы чакаюць з жахам.

Пётр ДУНЬКО.

Кніжны гасцінец

Аднаўляючы разбітыя вітражы

Беларускае апавяданне 1920—1930-х гадоў. Залатая калекцыя беларускай літаратуры. Т. 21. Мінск, «Мастацкая літаратура», 2021



Вы ўяўлялі, якой магла б быць беларуская літаратура, каб з яе штучна не выкраслілі дзясяткі выдатных імёнаў і сотні арыгінальных твораў? У 1920—1930-х гадах у яе прыйшло магутнае пакаленне, у асноўным дзеці вяскоўцаў, якія атрымалі доступ да адукацыі. Калі іх знішчыла рэпрэсіўная машына 1930-х, яны былі толькі на самым пачатку творчага шляху, у пошуку. Асабліва тое датычыцца празаікаў, творчая спеласць якіх, пераход на буйныя, эпічныя формы, звычайна адбываецца ў сталым узросце. Нават тыя, хто ацалеў, не мелі ўжо такой свабоды ў эксперыментах і выказваннях. Таму чытанне гэтага тома папулярнай серыі, дзе сабраныя апавяданні 1920—1930-х, — адначасова і магчымасць разбурыць стэрэатыпы наконт «прымітыўнасці» нашай літаратуры, і падстава для тугі...

Што б яшчэ мог напісаць Алесь Дудар, які загінуў у трыццаць тры, ці Лукаш Калюга, якому было дваццаць восем? Хоць у дваццаці пяці літаратараў зборніка розныя лёсы... Легендарная Зоська Верас, напрыклад, пражыла надзвычай доўгае жыццё... Але навела «Хворыя душы», напісаная маладой Людвікай, так і не стала зернеткам будучых кніг. Ян Скрыган, выдатны стыліст, прайшоўшы сталінскія лагеры і доўгую ссылку, вярнуўся на Беларусь ужо немаладым, змог аднавіць сябе як пісьменніка. Некаторыя імёны шырокаму чытачу невядомыя і стануць прыемным адкрыццём. Карціны вясковага жыцця і крывавыя перыпетыі рэвалюцыйнага часу, тонкі псіхалагізм, каларыт мовы... Усё закладзена тут. Вы нават знойдзеце беларускі варыянт гогалеўскага «Шыняля» — у апавяданні Сымона Баранавых «Боты», напісанага з той жа сумнай іроніяй, спачуваннем да маленькага чалавека і болем за ягоную абмежаванасць. Маладая задзірыстасць і вера ў будучыню адчуваюцца ў многіх творах... Што ж, беларуская літаратура, нягледзячы ні на якія выпрабаванні, не спыніла існаванне. І хай гэты том дадасць яшчэ адно шкельца ў яе вітраж, што аднаўляецца.

Джон Роскін. Лекцыі аб мастацтве. «Азбука-классика», Масква, 2021.



«Джон Роскін — адзін з найвыдатнейшых людзей не толькі Англіі і нашага часу, але і ўсіх краін і часоў. Ён адзін з тых рэдкіх людзей, які думае сэрцам, і таму думае і гаворыць тое, што ён сам бачыць і адчувае і што будуць думаць і гаварыць усе ў будучым».

Так казаў Леў Талстой.

Пра будучае ён не памыліўся. Тое, што ідэі Роскіна прынялі такія розныя людзі, як Оскар Уайльд, Махатма Гандзі і Марсэль Пруст, сведчыць аб іх універсальнасці. Хоць, здавалася б, нашто сёння перачытваць маралізатара віктарыянскай эпохі з цяжкім стылем і дзіўнымі на погляд сучаснага чалавека меркаваннямі? Але ж нездарма ў аўдыторыі Оксфардскага ўніверсітэта, дзе ён чытаў лекцыі, набіваўся студэнтаў пад завязку. Вядома, частка ягоных лекцый адрасавана менавіта мастакам. Роскін адкрыў творчасць Цёрнера, якога не разумелі, стаў «хросным бацькам» прэрафаэлітаў... Як любы таленавіты чалавек, быў складаны ў зносінах. Ажаніўся з маладой прыгажуняй Эфі Грэй — але нешта яму ў навяспечанай жонцы падалося агідным... І праз пяць гадоў Эфі з ім развялася, бо шлюб так і не быў фізічна пацверджаны. Выйшла замуж за ўлюбёнага вучня Роскіна, Міле, даўшы сюжэт шматлікім мастацкімі творам пра іх «любоўны трохвугольнік». Потым яшчэ адзін скандал — Роскін закахаўся ў адзінаццацігадовую Розу ля Туш, вельмі рэлігійную, як і ён сам, дачакаўся яе паўналецця, зрабіў прапанову — але сям'я, параіўшыся з Эфі, адмовіла... Розі хутка памерла. Роскін псіхічна захварэў...

Роскін палка гаворыць пра бядотнае становішча простых людзей і заганную сквапнасць і бяздзейнасць багацеяў. Тады, калі ўсе пісалі ўмоўныя прыгожанькія краявіды Старажытнай Грэцыі і Італіі, называе самай прывабнай рысай мастакоў *«асаблівае захопленае пачуццё ў адносінах да роднага ландшафту, які з'яўляецца для іх нейкім напамінам»*. У той час, калі мастацтва лічылася занятка разбэшчаных маргіналаў, даказвае: *«Мастацтва як галоўная прадукцыйная і стваральная сіла краіны ёсць дакладны паказчык яе маральнага жыцця»*.

Што ж, Роскін верыў у два галоўныя пачуцці — Гармоніі і Дабра. Шкада, жыццё не абмяжоўваецца гэтымі катэгорыямі. Але нішто не замінае імкнуцца да іх.

***Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.** Выданні для агляду прапанаваныя кніжнай крамай «Акадэмічная кніга», Мінск, пр-т Незалежнасці, 72.*

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.16	17.30	9.14
Віцебск —	8.10	17.15	9.05
Магілёў —	8.06	17.20	9.14
Гомель —	7.58	17.21	9.23
Гродна —	8.30	17.46	9.16
Брэст —	8.26	17.51	9.25

Месяц

Апошняя квадра 28 кастрычніка.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Ганны, Лізаветы, Аляксандра, Антона.*
К. *Яны, Альгерда, Віталя, Караля.*

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

4 ЛІСТАПАДА

У краіне

1816 год — нарадзіўся (в. Кублічы, цяпер ва Ушацкім раёне) Арцём Ігнатавіч Вярыга-Дарэўскі, беларускі пісьменнік-дэмакрат. Яго творы з-за цэнзурных праследаванняў не друкаваліся, большасць рукапісаў не знойдзена. Апублікаваны толькі «Плач салдаткі» (урывак з камедыі «Грэх чацвёрты — гнеў»). Першым пераклаў на беларускую мову «Конрада Валенрода» А. Міцкевіча. За ўдзел у паўстанні 1863—1864 гадоў сасланы ў Сібір, дзе памёр у 1884 годзе.

1876 год — нарадзіўся (г. Масква) Мікалай Мікалаевіч Дурнаво, філолаг-славіст, прафесар, член-карэспандэнт АН СССР, акадэмік АН БССР. У 1918—1924 гадах прафесар Саратаўскага, Беларускага і Маскоўскага ўніверсітэтаў, у 1928—1929-м — супрацоўнік Інстытута беларускай культуры і Беларускай АН. Адзін з родапачынальнікаў лінгвагеаграфічнага вывучэння ўсходнеславянскіх моў.

1887 год — нарадзіўся (г. Капыль Мінскай вобл.) Цішка Гартны (Дзмітрый Фёдаравіч Жылуновіч), беларускі пісьменнік, дзяржаўны і грамадскі дзеяч, акадэмік АН БССР (1928). Рэдактар газеты «Дзянніца», узначальваў Дзяржаўнае выдавецтва БССР, працаваў у Наркамаце асветы і ў Інстытуце гісторыі АН Беларусі. Выступаў як паэт, празаік, драматург, публіцыст, даследчык беларускай літаратуры і крытык. Аўтар раманаў «Сокі цаліны» і «Перагуды», зборнікаў апавяданняў «Трэскі на хвалях», «Прысады». У 1936 годзе арыштаваны, у 1937-м памёр. Рэабілітаваны ў 1988 годзе. Яго імем названы вуліцы ў Мінску, Капылі і іншых гарадах краіны.

У свеце

1890 год — у Лондане адкрываецца першая ў свеце падземная электрычная чыгунка — метро.

1955 год — ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР прынялі пастанову «Аб ліквідацыі празмернасцяў у праектаванні і будаўніцтве». Заканчэнне эпохі савецкага манументальнага класіцызму. Перавага цяпер аддавалася хуткаму і танному будаўніцтву.

1979 год — неўзабаве пасля Ісламскай рэвалюцыі ў Іране амерыканскае пасольства ў Тэгеране і 66 дыпламатаў, якія там працавалі, былі захоплены антыамерыканскі настроеным натоўпам; захоп падтрымаў новы ісламскі ўрад Ірана. Спроба вызваліць амерыканскіх дыпламатаў шляхам узброенай спецаперацыі правалілася: ваенны верталёт сутыкнуўся з самалётам, які стаяў на аэрадроме; загінулі восем амерыканскіх ваенных. Заложнікі былі вызваленыя толькі 20 студзеня 1981 года ў выніку перагавораў. Праваленая аперацыя па выратаванні заложнікаў і няздольнасць вырашыць канфлікт адмоўна адбіліся на рэпутацыі прэзідэнта Джымі Картэра і сталі адной з прычын яго гучнага паражэння на прэзідэнцкіх выбарах 1980 года.

Так гаварыў...

РЭЙ БРЭДБЕРЫ:
«Смерць — гэта форма расплаты з космасам за цудоўную раскошу пабыць жывым».

УСМІХНЕМСЯ

— У твае гады я ўжо карміў шматдзетную сям'ю!
— У сэнсе? У 18 гадоў?
І я ў вас адзін, здаецца?!
— Мяне на вакзале абабралі цыганы.

Усюды рэкламуюць свінку-дыетолага, якая ставіцца на халадзільнік і рохкае пры адчыненні дзверцаў. А дзе вавёрачка-нарколаг для бара?

— Хачу працаваць у цябе бухгалтарам, які графік работы?
— Год старанна працуеш, робіш усё, што мы скажам, а тры сядзіш, адпачываеш.

Калі вазон пасля падзення з падаконніка ад няёмкага руху ката зацвіў — узнагародзьце ката!

Мужык прыйшоў да празорцы — пацікавіцца, ці не здраджвае яму жонка.
Толькі адчыніў дзверы кабінета, як тая яму крычыць: «Мужчына, прыгніцеся! Я бачу ў вас вельмі высокія рогі!»

Мужчыну ўпрыгожвае сціпласць, а жанчыну — і сціпласць, і адзенне.

Малюнак Кацярыны АКУЛІН.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы
тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2984.

Нумар падпісаны ў 19.30 3 лістапада 2021 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12